Людзі прабуюць да зямлі вярнуцца ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Беларускі голас з Сямятыч: ЯЗЭП КАРПЮК ☞ 5



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 6 (2491) Год XLIX | Беласток, 8 лютага 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Наш хлопец у Багдадзе, калі стоміцца, слухае „Н.Р.М.", думае пра „Басовішча", Беласточчыну, бацькоў...

З мікрафонам у Іраку

З Тамашом САЕВІЧАМ, карэспандэнтам Польскага Радыё ў Іраку гутарыць Ганна Кандрацюк.

— Тамаш, як ты апынуўся на вайне?

— Пазваніў тэлефон. Мяне выклікаў Міхал Малішэўскі, дырэктар Радыё Палёнія на размову і спытаў ці я зацікаўлены працаваць карэспандэнтам Польскага радыё ў Іраку (раней маю кандыдатуру разглядала кіраўніцтва Польскага радыё). Я згадзіўся цягам трох секунд.

У Ірак ехаў з вялікім хваляваннем — ці вытрымаю тыя ўмовы і ці змагу рабіць прынамсі два-тры матэрыялы ўдзень. Раней я зусім не меў сутыкнення з працай карэспандэнта ў небяспечнай арабскай краіне.

— Першы шок?

— Першы шок перажыў я на „Сільвестра". З нашай гасцініцы ў Багдадзе мы з маім сябрам, карэспандэнтам Польскага Радыё Міхалам Кукаўскім, ехалі на нашай машыне ў славуты гатэль „Палесціна", дзе ў час ваенных дзеянняў жылі журналісты. Была дзевятая вечара. Мы павярнулі ў цёмную вулачку. Удалечыні пачулі мы выстралы з калашнікава. Пасля тыдня чалавек прывыкае да стрэлаў — іракцы гэта такая нацыя, якая любіць сабе „пастраляць". Праехалі мы нейкія 200 метраў і я пачуў вялікі гул каля машыны. У цемры, можа 50 метраў ад нас, стаяў мужчына з калашом і страляў. Скажу шчыра, я не хачу думаць — ці страляў ён у наш бок ці можа ў паветра на прывітанне Новага года. Але ніколі не забуду свісту куляў за шыбай машыны. Нам пашчасціла ўцячы.

— Ці меў ты нагоду размаўляць са звычайнымі іракцамі?

— Шмат разоў. Праз тры першыя тыдні майго прабывання ў Іраку я жыў выключна ў Багдадзе і, шчыра кажучы, найбольш задавальнення маю ад падарожжаў з мікрафонам па вуліцах Багдада. Сустрэўся я з вялікай ветлівасцю іракцаў, гэта вельмі ганарысты народ, для іх важныя прынцыпы. Адзін з іх пашана для гасцей. Хаця зараз „гасцямі" цяжка назваць сілы кааліцыі. Таму шмат іракцаў лічыць, што гэта краіна пад акупацыяй, а палякі — часам і польскія журналісты — гэта акупанты.

— Менавіта, як успрымаюць вайну самі іракцы?

— Ад некалькіх гадоў „непапраўны аптыміст". Беларус ад пачатку да канца. Меў вялікае шчасце вучыцца ў Беларускім ліцэі ў Гайнаўцы. Пасля, як паступіў у Варшаўскі універсітэт, пачаў працаваць журналістам, найперш у часопісе „Cogito", далей у Беларускай рэдакцыі Польскага радыё і Радыё Рацыя. У Другой праграме Польскага радыё вёў выпуск „Культурныя навіны". Да выезду ў Ірак працаваў замежным карэспандэнтам Радыё Палёнія — рэалізаваў праграмы Польскага радыё для замежжа, дзе абслуговаў замежныя падарожжы польскіх палітыкаў. Дзякуючы гэтаму спалучыў дзве найбольшыя жарсці жыцця — падарожжы і журналістыку...

— Як не дзіўна гэта гучыць, але сам я неаднаразова чуў ад іх, што вайну яны ўспрымаюць „нармальна". Да ваенных дзеянняў яны паспелі прывыкнуць. Аднак не прывыклі і пэўна не прывыкнуць да таго, каб пра іх лёс вырашалі іншыя нацыі. Вялікае, бо аж 70-працэнтнае беспрацоўе, праблемы з пастаўкамі вады і электраэнергіі, праблемы з купляй паліва на аўтазаправачных станцыях у краіне, якая перад вайной была другім у свеце экспарцёрам нафты.

— Ці маеш магчымасць пабываць у цэнтры здарэнняў, у агні?

— Па-першае, ва ўмовах небяспекі трэба мець галаву на сваім месцы. І калі прабываючы ў Багдадзе чую ўзрыў, бягу разам з іншымі журналістамі ў машыну, каб адшукаць месца правядзення тэракта. Некалькі разоў мне ўдалося быць пару хвілін пасля выбуху бомбы ў месцы здарэння. Гэта жахлівыя сцэны, пра якія цяжка расказваць і пісаць. Ідзеш па вуліцы і бачыш целы забітых, або паразрываныя людскія часткі цела.

Не хачу каб склалася ўражанне, што гэта нейкі гераізм з аднаго боку, або дурніца — з другога. Такая наша журналісцкая праца.

— Праблемы з вайсковай цэнзурай?

— Калі хачу зрабіць матэрыял пра жыццё жаўнераў, пра армію — якраз студыя Польскага радыё ў Вавілоне знаходзіцца на тэрыторыі вайсковага лагера, у якім жыву — такая сітуацыя крыху „звязвае рукі". Тады розныя дылемы. Адно, што магу сказаць, стараюся падкапаць міф створаны польскімі СМІ — міф польскай зоны ў Іраку. У жартах чуў я нават пра „Ірацкае ваяводства". Па-першае — гэта сектар адказнасці шматнацыянальнай дывізіі пад польскім кіраўніцтвам, дзе служаць салдаты 25 нацый. Па-другое, на ніводных прапагандысцкіх матэрялах пра сілы кааліцыі, апрача амерыканскага і брытанскага сцягаў, я нідзе не бачыў польскага сцяга. Мне здаецца, што ў гэтай сітуацыі трэба ўсё ж такі параўнаць Польшчу і ЗША.

— Ці сярод жаўнераў сустрэў беларусаў? Праваслаўных?

— Беларусаў я не сустрэў (зразумела тых з Польшчы). Кантактуюся з жаўнерамі ўкраінскага кантыгента, якія дыслацыруюцца ў Вавілоне і Аль-Кут. Ёсць праваслаўныя румыны, балгары, зразумела — некаторыя ўкраінцы. Пакуль сустрэў аднаго хлопца з Беласточчыны — татарына, які працуе перакладчыкам у арміі.

— Як ва ўмовах вайны дзейнічае моц беларуса з Гайнаўкі?

— Шчыра кажучы — моц для мяне самая важная. Калі я стомлены — а зараз пастаянна стомлены, бо працую за трох — хопіць, што паслухаю гурт „Н.Р.М." — асабліва песню „Тры чарапахі" — ды прыгадаю сабе як гуляў з Табой пры ёй на „Басовішчы" ці на „Купаллі" — і адразу мне лепш. Хачу прыгадаць маіх цудоўных бацькоў — частку гэтай пазітыўнай моцы, якую дае сям'я, што пастаянна хвалюецца за маё жыццё. Стараюся ісці ў жыцці ў напрамку, які вызначыў Рышард Капусцінскі — толькі добры чалавек можа быць добрым рэпарцёрам.

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

Дуля з макам ☞ 2

Мікола ВАЎРАНЮК

Мужыкі шумяць. Абіваюць парогі сядзібаў запрацаваных чыноўнікаў, заклапочаных светлай будучыняй краіны палітыкаў. Чагосьці патрабуюць, аб чымсьці голасна, перабіваючы адзін аднаго, гавораць. Парушаюць цішыню ўтульных кабінетаў, уводзяць нервовасць...

Адсутнасць публіцыстыкі ☞ 4

Міхась КУПТЭЛЬ

І падумаць толькі, што калі б беларус думаў як беларус, то маючы ўладу, прынамсі ў гмінах, паветах, гарадах і мястэчках усходняй Беласточчыны ствараў бы базу для развіцця сваёй культуры, узбагачаючы не толькі беларускую культуру але і польскую, паколькі жывем мы тут, у Польшчы...

Вачыма паляка ☞ 5

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

З выступлення шэфа польскага МЗС не вельмі я зразумеў тую сёлетнюю мэту аб „umacnianiu podmiotowości" Беларусі ў міжнародных структурах. Як дасюль, нягледзячы на (нешматлікія) усмешкі прадстаўнікоў адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі да міжнародных арганізацый, такіх як Савет Еўропы, іх становішча не памянялася, надалей яно халоднае. Іначай не будзе, пакуль элементарныя дэмакратычныя прынцыпы Беларусь не пачне выконваць.

ВНУ без экзамена ☞ 8

Аляксей МАРОЗ

Зараз многа вучняў прыступае да алімпіяды беларускай мовы, бо яе пераможцы карыстаюцца вялікімі прывілямі. Лаўрэаты і фіналісты цэнтральных элімінацый могуць паступаць на многія спецыяльнасці вышэйшых навучальных устаноў без экзаменаў. Вырашаюць аб гэтым сенаты паасобных ВНУ...

Нарманы ☞ 9

Алег ЛАТЫШОНАК

Андрэй Катлярчук сваёй кніжкай „Шведы ў гісторыі і культуры Беларусі" (Мінск 2002) узнавіў дыскусію аб ролі нарманскага (варажскага) чынніка ў гісторыі нашай краіны...

Занатоўкі кантрабандыста ☞ 10

Сымон ГАЛЬШАНСКІ

Гэтая кепская навіна застала нас на Гайнаўскім рынку. Мой калега быў у адчаі. Напіўся спірту, як травеньскі кот валяр'янкі, і ні з кім не хацеў размаўляць. Чалавек ён быў надзвычай скупы. Галоўным яго заняткам было па сто разоў пералічваць нагандляваныя залатоўкі...

9 770546 196000

Міжвольныя скандалісты

Здавалася мне, што скандаліст — гэта той, хто ўчыняе скандал, скандаліць. Але мінулагоднія падзеі, якія разгарнуліся пасля кантролю Беластоцкай дэлегатуры Найвышэйшай кантрольнай палаты ў нашай рэдакцыі паказалі, што можна атрымаць гэтую мянушку не скандаліўшы. Дастаткова апынуцца ў становішчы, калі ўчыняюць скандал вакол установы, і сам міжвольна становішся скандалістам. Ніхто тады ўжо не памятае, ці гэта ты сам учыніў скандал, ці табе яго зрабілі.

Кантрольныя органы, сцвярджаюць чыноўнікі, выкарыстоўваюць магчымасці, якія даюць ім заканадаўцы. Калі заканадаўства недасканалае, чыноўнікі інтэрпрэтуюць законы ў сваю карысць, часта даводзячы кантраляваную фірму да банкруцтва. Прыкладам гэтаму можа быць гучная справа вакол буйнай кампʼютэрнай фірмы „Оптымус" і пачаткова арыштаванага яе старшыні, якога нядаўна апраўдаў суд. А кантралёры за гучныя справы, асабліва тыя, які перадаюцца на далейшае расследаванне ў пракуратуру, атрымоўваюць прэміяльныя. І нават калі суд апраўдае апальных прадпрымальнікаў, чыноўнікі кантрольных органаў не нясуць адказнасці за памылковыя абвінавачанні і не вяртаюць атрыманых у якасці прэмій грошай. Аб праблеме хворай прэміяльнай сістэмы заахвочвання ў кантрольна-падаткавых органах загаварылі пры нагодзе справы „Оптымуса" палітыкі і публіцысты.

Хаця „Ніва" не „Оптымус", гучнасці нашай справе прыдалі беластоцкія сродкі масавай інфармацыі — спачатку „Курʼер паранны", якому „сенсацыйны кампрамат" падкінулі нядобразычліўцы, а за ім усе інсінуацыі паўтарылі „Газета выбарча", радыё і тэлебачанне. На першы план ставілася справа „незаконна выдадзеных 174 тысяч злотых". Кантралёр абвінаваціў нас у фінансаванні „Нівы" ў міждатацыйны перыяд, што на працягу кантраляваных двух гадоў склала згаданую суму. Адным словам, калі б мы выдавалі ўсе датацыі ў тэрмінах пазначаных у дамовах са спонсарам, праблемы не было б. Але тады не было б грошай на выданне тыднёвіка ў перыядах паміж паасобнымі датацыямі (3-4 месяцы на зломе года). А мы, наіўныя, эканомілі, каб грошай хапіла на ўвесь год. Кантралёра не цікавіла, што „Ніва" выходзіла рэгулярна на працягу года, яму важнейшыя былі тэрміны выдавання грошай. Хачу адзначыць, што датацыя выдавалася мэтазгодна — на выданне „Нівы", і не прапаў ніводзін грош. Нашы тлумачэнні адобрыў спонсар — Міністэрства культуры. І калі здавалася, што справа будзе мець свой шчаслівы канец, Беластоцкая дэлегатура найвышэйшай кантрольнай палаты накіравала справу ў пракуратуру. Паліцыя правяла ўжо сваё расследаванне, а паўторнай праверкай фінансавых дакументаў займаецца эксперт па бухгалтарскай справе. Рашэнне пракуратуры яшчэ наперадзе.

Наша справа была настолькі гучнай, што адбілася рэхам і ў беларускай прэсе. „Рабілі хлопцы «Ніву», зарабілі канфлікт" — напісала мінская „Наша Ніва" летам мінулага года, паўтараючы ўсе сенсацыі беластоцкіх СМІ, пералічваючы нашы датацыі на долары і ўздыхаючы з зайдрасцю: „От каб беларускім газетам ды гэткія датацыі..." Здавалася, Мінск ад Беластока далекавата, таму беларускія сталічныя журналісты бачаць нас толькі праз прызму польскай прэсы. Але вось нядаўна пра „Ніву" напісала гродзенская „Пагоня", якой аўтары несумненна лепш разбіраюцца ў нашых рэаліях. І хаця аўтар артыкула „Беластоцкая «Ніва» на новы лад" здзіўляецца, „што і некаторыя выданні ў Беларусі «купіліся» на танную сенсацыю і перадрукавалі інсінуацыі польскіх шавіністаў, чым пакрыўдзілі беластоцкіх братоў-беларусаў", сам дапускаецца гэтага ж граху, называючы склаўшуюся ў нас сітуацыю „фінансавым скандалам". Піша ён: „Фіскальная камісія закідала супрацоўнікам «Нівы» нямэтавае выкарыстанне дзяржаўных грошай у суме 174 тысячы злотых (больш за 40 тысячаў долараў!)". Няма нямэтавага выкарыстання, бо датацыя выдавалася мэтазгодна. Абвінавачваюць нас у „незаконным" выкарыстанні — парушэнні тэрмінаў выдавання датацыі. І да гэтага той пералік згаданай сумы на долары завершаны клічнікам. Відаць, валюта моцна ўзбуджае ўяўленне аўтараў за ўсходняй мяжой.

Аказваецца, што і ў сябе, і за мяжою мы — скандалісты, міжвольныя.

Віталь Луба

Дуля з макам — *або нараджэнне грамадзянскай супольнасці*

Мужыкі шумяць. Абіваюць парогі сядзібаў запрацаваных чыноўнікаў, заклапочаных светлай будучыняй краіны палітыкаў. Чагосьці патрабуюць, аб чымсьці голасна, перабіваючы адзін аднаго, гавораць. Парушаюць цішыню ўтульных кабінетаў, уводзяць нервовасць.

— Панове, давайце не будзем вяртацца да таго, што здарылася некалькі гадоў таму, — супакойваюць нявыхаваных прышэльцаў гаспадары. — Лепш засяродзімся на вырашэнні бягучых пытанняў.

Разумныя вочы зямных заступнікаў ззяюць цеплынёю і дабрынёй. А з вуснаў іх не словы плывуць, а проста льецца мёд.

Звычайна пасля такога сардэчнага прыёму мужыкі супакойваюцца, заціхаюць. Сыходзячы не ведаюць, як і выказаць сваю ўдзячнасць. Ад няёмкасці мнуць у руках казырастыя шапкі і пластмасавыя пакеты.

Хвіга з макам-пастарнакам! — сказалі жыхары Гацькоў, Райска і Парцава ды сапсавалі ідылічны абразок, да якога ўсе прывыклі. Зрабілі сапраўдны шум, якога не суцішыць ласкавым словам гміннага чыноўніка, абяцанкамі народнага абранніка, закулісными таргамі Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці.

Сяляне, аказалася, пра будучыню дбаць умеюць. Не толькі не пасварыліся за зямлю (тыповае для ўсіх падзелаў-камасацыяў), але хутка дагаварыліся, на якія ўчасткі яе пабіць...

Справа тычыцца — як я ўжо двойчы пісаў — зямлі ў гэтых вёсках. Чыя яна будзе праз пару гадоў? Кім без яе стануць мясцовыя людзі?

Гаспадары з названых вёсак Бельскай гміны дабіваюцца таго, каб палі і лугі, якія рабілі іх дзяды-прадзеды, зноў сталі іхняй уласнасцю. Цяпер, у выніку гісторыі і грамадска-эканамічных эксперыментаў Польскай Народнай Рэспублікі, гэта дзяржаўная маёмасць, з якое жывуць прыезджыя, чужыя людзі.

Гэта раянам, гацькаўцам, парцавюкам найбольш баліць. Хочуць яны высветліць, хто і чаму за дэмакратыі так распарадзіўся зямлёю, на якой пры народнай уладзе зрабілі ПГРы. У адказ чуюць: не чапайце мінулага, дбайце пра будучыню. Засталося яшчэ крыху ПГРаўскай зямлі. За яе змагайцеся. Мы вам паможам.

Сяляне, аказалася, пра будучыню дбаць умеюць. Не толькі не пасварыліся за зямлю (тыповае для ўсіх падзелаў-камасацыяў), але хутка дагаварыліся, на якія ўчасткі яе пабіць. Калі Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці правядзе аўкцыён, змогуць яны яе арандаваць... год. А тыя, што сваім гаспадараннем дапусціліся дэвастацыі будынкаў у Райску, ходзяць чуткі, збіраюцца арандаваную зямлю купляць!

І нашто быў патрэбны ўвесь гэты закалот? — скажа чытач-малькантэнт. Беларускі мужык спрадвеку ведаў, што супраць ветру не падуеш! Зноў выйшла паводле яго.

Дуля з макам! — на гэты раз мая. З зямлёю пакуль нічога яшчэ невядома. Але ўжо відаць адзін станоўчы — вельмі важны — элемент гэтага змагання за зямлю. У тых вёсках нарадзілася сапраўдная грамадзянская супольнасць, з якою мусяць лічыцца чыноўнікі, палітыкі, паны і падпанкі.

У мінулым годзе гаспадары з Райска, Гацькоў, Парцава ўпершыню даведаліся пра магчымасць набыць зямлю. Раней аўкцыёны праходзілі ў Сувалках. Аб'явы пра іх дзесьці віселі, адно не ў гэтых вёсках, на тэрыторыі якіх распаложана зямля. Мясцовыя даведваліся пра змену яе гаспадароў толькі тады, калі на поле ўязджалі трактары нябачаных раней там дзядзькоў.

Сёння ім кажуць: дзе вы тады былі? Чаму не баранілі свае інтарэсы ў час? Сёння ўжо позна вяртацца да тых падзей.

Паслухаюць яны гэтую параду, ці не — іх справа. Але, каб не тое, што цяпер яны сарвалі заслону, якая шчыльна атуляла абарот зямлёю, праз пару гадоў пачулі б зноў тое самае. Іншая была б толькі сітуацыя. Уся зямля была б ужо даўно прададзена.

А так — дуля з макам!

Мікола Ваўранюк

Адышоў Аляксандр Малахоўскі



Ва ўзросце 80 гадоў памёр Аляксандр Малахоўскі, палітык і публіцыст, якому на сэрцы ляжалі таксама праблемы нацыянальных меншасцей Польшчы і сітуацыя ва ўсходніх суседзяў. Апошні раз размаўляў я з Аляксандрам Малахоўскім год таму. Тую размову выкарыстаў я ў „Ніве". Гаварыў ён тады:

— Беларусь гэта наша натуральная суседка і ад гэтага не ўцячэм.

Пазнаёміўся я з пазнейшым дзеячам першай „Салідарнасці", маршалкам Сейма, заснавальнікам Уніі працы, калі мне было гадоў дзесяць, у палове сямідзесятых. Мой бацька забраў мяне ў адзін снежаньскі дзень у сваю фірму — культурную рэдакцыю варшаўскай II праграмы Польскага радыё. У адным з пакояў размаўлялі з палам аб чымсьці пазнейшыя апазіцыйныя дзеячы, а тады працаўнік і тае рэдакцыі: Івона Смолька, Аляксандр Фрэдра (Банецкі) і якраз Аляксандр Малахоўскі, які ўжо тады насіў характэрную талстоўскую бараду. Мабыць, тады я падумаў, што выглядае ён як святы Мікола. А, можа, таму, што пачаставаў ён мяне кока-колай, якой смак якраз тады і дзякуючы яму я спазнаў.

Пасля, у дарослым жыцці, не раз мы сустрэліся ў Беластоку. Ён быў беластоцкім дэпутатам ад Уніі працы, я — беластоцкім журналістам. Калі ішлі мы разам Ліпавай вуліцай, на Аляксандра Малахоўскага нахлынулі ўспаміны. Памятаю, што расказваў ён тады, як трапіў раннім летам 1940 г. у Беласток, уцякаючы з Львова ў Генеральную губерню. Спыніўся тут не па сваёй волі, арыштаваны НКУС і зняволены ў падвалах па вул. Міцкевіча. Пару гадоў пасля сустрэліся мы ў Апеляцыйных судзе, сцены якога прылягаюць да тае былое турмы. Сядзелі мы ў калідоры на лавачцы, чакаючы прысуду ў справе ягонага публічнага выказвання наконт, як ён бескампрамісна акрэсліў, маніпуляцыі правых членаў Гарадской управы ў час жараб'ёўкі камісій, якія мелі працаваць над адным з рэферэндумаў.

— Гляньце, які парадокс. Столькі гадоў мінула, а я зноў у гэтым самым месцы ды падсудны, — прабаваў жартаваць.

Апеляцыйны суд пацвердзіў, што мусіць ён перапрасіць членаў управы, якіх, на яго думку, трэба было дэкрэцінізаваць. Пасля таго, як мы выйшлі з залы разбораў, калаціўся ён ад нерваў, і паціраючы родавы сігнет, паўтарыў сваё славутае выказванне:

— Камунізм працягваецца, ды гэта камунізм — белы.

Я не здзівіўся, калі б у той час сталі перад ягонымі вачыма таварыш з камеры. Амаль усіх былі вывезлі і расстралялі ў падмінскіх Курапатах. Я не здзівіўся, калі летась, як прадстаўнік польскага парламента ў Савеце Еўропы, не сустрэўся ён з апазіцыяй, а ў час, калі мела гэта адбывацца, паехаў якраз у Курапаты, выпрасіўшы згоду ў мясцовых улад аддаліцца ад дэлегацыі. Мабыць, прадчуваў, што мусіць развітацца з турэмнай браццю, якая пераканала тады пятнаццацігадовага Оля Малахоўскага да ідэі сацыялізму.

— Павагі да сацыялістычных ідэй я навучыўся ў беластоцкай турме, калі маімі таварышамі па нядолі была грамада лодзінскіх сацыялістаў, зняволеных НКУС, — паўтараў.

Адышоў Аляксандр Малахоўскі, мудрэц з Падолля, сумленне польскай лявіцы, палітычных эліт увогуле, таксама тых, з кім выводзіў Польшчу ў свет дэмакратыі і незалежнасці, які ствараў III Рэч Паспалітую не аднаго народа.

Мацей Халадоўскі

А ці ў нашым узросце можна пачаць новае жыццё?

Хто шукае рэлігійную экзотыку

Выбрацца ў перадзім'е ўдалячынь без машыны — справа не такая страшная. Прывычка робіць сваё. Амаль дваццаць гадоў я ў „Ніве", даўжэйшы час даводзіцца ўсім нам абыходзіцца без рэдакцыйнага аўто, і хто пешкі, хто на рыпучых аўтобусах ці на сваім расклекатаным „малюху", як калісь Алесь Вярбіцкі, адольвае ненайлепшыя шляхі роднае старонкі. А калі ёсць нагода праехацца на цёплым сядзенні, у мілай кампаніі — дык чаму ж і не. Тым больш, што мой сябра з польскай газеты выбіраецца шукаць экзотыку на Беласточчыне. Ат, тая экзотыка не пераелася яшчэ журналістам з цэнтральнай Польшчы, словам, з захаду, бо дзе ж у нас не сустрэнеш старасвеччыну ды дзівы, як не на Усходняй сцяне. Мірык, аднак, тутэйшы, і не адно ўжо пабачыў, у нас таксама, філосаф, быўшы і аніматарам культуры, і фільмоўцам, і спраўджаным пісакам. Але ж не будзе пісаць пра простую, тутэйшую экзотыку, беларускую, не аб „праваслаўных паляках", як ён гэта называе, а аб басяках. Ці прасцяках, задумваецца, як ім там. Не вельмі разбіраецца ў назовах, ды гатовы паказваць іх нават у нямецкай праграме, бо тамака запрапанавалі яму паказаць сапраўдныя дзівы тутэйшасці, адухоўленай і незвычайнай, а нават і нашых шаптух. Бо тое, што мае паказаць, мае гледача ці чытача са старое, знуднелае Еўропы зваліць з ног. І едзе трохі так за носам — пачуў, знюхаў —

будзе тэма?

А тутэйшую мову разумее, бо хто ж не зразумеў бы, меўшы бабу з дзедам з Рыбакоў. Ужо на патойбаковым улонні пасвяць яны нябесных авечак, а хата стаіць. Такі пункт Мірыка Грыкі. Блізкага мне, бо адчуваю ягоныя захапленні і болі, майго аднагодка. Слухаю ягоныя разважанні, калі імчымся і крыху ўсміхаюся: от, як той крот, тыцкае носам у тэму, распальваецца загадзя, а што потым будзе? Хоць ён сам не вясковец, у сяло ездзіў быў на канікулы, як ніхто рассакрэціў нашу вёску ў сваіх *Апавяданнях з-над Нарвы*. — Толькі не распавядай мне тры гадзіны, як на сустрэчы ў Ломжы, пра тое, што твой сэнс — Беларусь. У мяне штораз больш знаёмых апантаных тою вашай Беларуссю...

А ці ў нашым узросце можна пачаць новае жыццё?

— такое пытанне пастаўлю Аляксандру Пагуру ў Чаромсе.

Я звычайна жыву. Гадую сям'ю. А маім сэнсам ёсць... сапраўды... Захаваць у памяці нашу зямлю. Рабіла б у полі — таксама захавала б.

Мірык адмахнецца ад яго, таго пытання, як ад мухі — не пасуе яно да пошукаў „экзотыкі". Распытвае Олька і Яўгінню Пагураў аб „усе веры" ў ваколіцы. Дзе тут тыя басякі-прасцякі, дзе пяцідзесятнікі-зялёнасвяткоўцы, адвентысты, дзе баптысты... Якую тут я магу мець арыентацыю! Чытала ў „Ніве" пра свядомых беларусаў-баптыстаў? О, прасцякі аж у Малінніках? І пра мовы пытаемся, якімі яны карыстаюцца. Олік, сваяк бацюшкі, мае шмат такой, усё ж ніякай не экзотыкі, нават на сваёй вуліцы элегантных дамоў, у большасці чыгуначнікаў, бо Чаромха стаяла на чыгунцы — пяць вераў.

Яўгіння Пагур таксама *каляярка*, як і Аляксандр. Усё жыццё на чыгунцы.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Яўгіння Пагур: „Разбудоўваем свой дом"

— Я сам з вёскі, што на мяжы з Беларуссю. Тут усе, хто з ваколіцы, жыў з чыгункі. Цяпер даводзіцца мяняць прафесію. І мы думалі з'ехаць у Беласток. Грошай крыху сабралі, купілі дзве кватэры ў Беластоку. Сыну нашаму 22 гады, дачцэ — 8. Але перадумалі, вось, сваю хату адрамантавалі, жывем. Брацца трэба за бізнес, бо нічога не будзе. Але гледзячы на ваколіцу — то ж бачыш: *wrócą po nas knieje*. Людзі прабуюць да зямлі вярнуцца (і я сам думаў), што карміла пакаленні, пазбыліся яе, а цяпер купляй яе як чужую.

Значыць, наш аднагодак Аляксандр рашыў застацца на родным, а тое, што набыў за зароблены грошы — у сталіцы ваяводства, вядома, дзецям. Цяпер — не ўдалося б яму сабраць на пасаг для дзяцей. Час цяжэйшы. Мясцовасць падае. Часам здаецца, што жыць няма як.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Олік Пагур на чаромхаўскай вуліцы

Ніякіх кантактаў з бязглуздымі „пісакамі"

Ідзем па чаромхаўскіх вуліцах у бок мяжы. Па дарозе заглядаем у мэблевую крамку, дзе стаіць маладзенькая прадаўшчыца... вучаніца другога класа гімназіі. Гэта дачка Марысі Дубягі — падказаў нам Олік, што якраз Дубягі — з тае экзотыкі якую шукае Мірык. Жывуць на самым канцы Фабрычнай вуліцы, пад самаю мяжой з Беларуссю. Па дарозе маем зайсці да пана Дунды, ён з прасцякоў. Але дзядзька адмаўляецца даваць якія-небудзь інфармацыі: прыехалі былі нейкія шукальнікі экзотыкі з Варшавы, панапісвалі цудаў, і пасля пан Дунда меў непрыемнасці ў сваёй царкве, турбавалі яго начальнікі. Ніякіх кантактаў з бязглуздымі пісакамі!

Супраць „пісакаў" таксама свякруха Марыі Дубягі, але аб гэтым даведаемся крыху пазней. Не так супраць цікаўных ды дапытлівых, як чужых. А хто яго ведае, хто да цябе на падворак заглядае? Прыязджаюць ашуканцы, зладзеі, усялякія аферысты. Стала бабуля пад вілай, суха кажа: „Няма маладых, ідзіце сваёй дарогай". Мірык папраўляе акуляры збянтэжаны — вось, траціць нітку тэмы, перціся трэба будзе ў тыя Малінніки, а тут і цямнее, дахаты трэба...

— І што, кажэце, страшнавата так пад мажою жыці? — пытаюся ў напалоханай жанчыны па-семяноўску, а тая весялее, пачуўшы маю гаворку і крычыць на паверх вілы: „Марыся, да нас госці!"

У Марысі Дубязе, крыху папаўнелай бландзінцы пазнаю дзяўчыну з гайнаўскага белліцэя, а хутчэй яна мяне пазнае: мела я ў іх настаўніцкую практыку. Ці памятаю дзвюх дзяўчынак-баптыстак, Марысю Назарук з Палічнай і Алю Рыбак з Тафілаўцаў? Марыся расказвае аб сваіх вандраваннях у пошуках Хрыста — ад баптыстаў, праз незалежных прасцякоў (яны маюць свой збор якраз у Малінніках) — у іх прыняла хрышчэнне, вяртанне да пяцідзесятнікаў, там з мужам. Мірыку тое Марысіна пералічванне хрысціянскіх цнотаў здаецца, мабыць, нуднаватым — не цікавіць ейнае звычайнае гаспадарска-хрысціянскае жыццё. А Марыся кончыла Біблейскі інстытут у Мінску, вядзе хор у Дубічах-Царкоўных. Для мяне гэта ніякая не экзотыка — заўсёды было ў мяне шмат знаёмых, якія па-рознаму веравызнавалі і хвалілі Хрыста, а нацяжка было мне быць талерантнай да добрых, працавітых, шчырых людзей, у большасці свядомых беларусаў. Распытваю аб прозвішчы вернікаў, адкуль яны жонак маюць (шмат дзяўчат прыехала з Беларусі і Украіны), харавы рэпертуар. Гэта Марысін спосаб на прыстойнае хрысціянскае жыццё ў цяжкі час. Вось, Марыся з мужам Андрэем стараюцца, каб іх чацвёра дзяцей мелі правільную духоўную страву (няма ў хаце тэлевізара), вучаць іх, працуюць. Займаюцца гандлем — вось у той іхнай краме можна купіць усё для пабудовы, рамонту і абсталявання хаты. Панелі, сайдынг, пліты — у сезоне сходзяць добра. Значыць, людзі жывуць і жыць хочуць, калі думаюць аб тым, каб будавацца, упрыгожваць жыллё...

Мірык заспяшаўся — мы з Марысяй трапілі на захапляльную тэму родаў (аказваецца, радзіла яна сваю дачку, тую, што стаяла ў краме, у адзін дзень з маёй сястрой, і прыгадала, пра што яны 14 гадоў таму тады размаўлялі па-беларуску, стоячы ля начнога акна гайнаўскай бальніцы: як будуць жыць праз пару дзесяткаў гадоў). Азіраецца на дзверы — Марыся гэта абзац у яго ўяўным яшчэ тэксце, і то добра, — і наша аўто рванула ў бок Дубіч-Царкоўных, *tygla wyznaniowego*. Мой калега лямантуе:

— Ну, няма тэмы!?

— Людзей жа бачыш і чуеш? — даюся дзіву.

— Тэма разлазіцца проста ў руках, — не слухае мяне ані крышку новаспечаны рэпартажыст

зацыклены на экзотыцы ды сенсацыі.

У бацюшкі Славаміра Аўксеціюка, на пытанне аб канфлікты, даведваецца, што тут у нас „платы не дзеляць, а спалучаюць" (ля царквы паявіўся, а як жа, наш аднагодак, Славік Кулік з неадлучным фотаапаратам — гэта таксама адзін са спосабаў на цікавае жыццё).

— А ў нас тут сустракае людзей звонку сардэчнасць і талерантнасць, а гэта ніякая не незвычайнасць, — усміхаецца войт Дубіцкай гміны Анатоль Паўлоўскі. Жывуць тутэйшыя, як умеюць, бо жыць жа трэба. Войт тут ужо 22 гады.

Ужо цямнела, як вярталіся мы ў Беласток. Маўчалі.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Марыся Дубяга

Усё ж, мой сябра знайшоў нейкую экзотыку. Не звочыў, праўда, людзей. Што ж, папуталіся яму ўсе веры ды, упарта, беларускасць з тутэйшасцю, але стараўся сумленна. Не дарма ж гнаў машыну такі ладны кавалак дарогі! Затое дзяжурны сакратар ягонай газеты вычысціў пад здымкам, на якім я была з Олікам Пагурам на чаромхаўскай вуліцы подпіс, што ідзе тут з героем журналістка *беларускай „Нівы"*. Мабыць, каб тая экзотыка чытачам з чымсьці не асацыявалася?..

Міра Лукша

Спорт у Бельскім павеце

Арганізацыяй спартыўных мерапрыемстваў на тэрыторыі Бельскага павета займаецца галоўным чынам Павятовы школьны спартыўны саюз, а побач яго яшчэ гмінныя самакіраванні і школы. ПШСС узнік 30 лістапада 1999 года (заміж былога Раённага школьнага спартыўнага саюза), а яго працай кіруюць старшыня Міраслаў Галамбёўскі, ягоныя намеснікі Ян Зямцоў і Яўген Бэдэнічук, сакратар Уладзімір Баравік і казначэй Ніна Тымінская. У склад управы ўвайшлі таксама прадстаўнікі старостваў і ўсіх гмін павета.

У 2003 годзе ў рамках ваяводскага спартыўнага спаборніцтва паветаў за кубак маршалка Падляшскага ваяводства з улікам усіх катэгорый школ па сумарным балавым падліку Бельскі павет апынуўся на восьмым месцы.

Сярод пачатковых школ найлепш паказала сябе Пачатковая школа н-р 4, якая перамагла ў III падляшскіх гульнях па валейболе хлопцаў (апякун Яўген Хількевіч). Па сумарным падліку пачатковых школ Бельскі павет апынуўся на 10 месцы.

У катэгорыі гімназічных школ Публічная гімназія н-р 1 у Бельску-Падляшскім перамагла ў Лёгкаатлетычнай лізе дзяўчат (апякун Кшыштаф Сяргей). Згаданая гімназія была шостай у катэгорыі дзяўчат, а павет апынуўся на 9 месцы.

У рэйтынгу звышгімназічных школ Бельскі павет заняў 3 месца. Управа павета ў Бельску-Падляшскім лічыць, што спартыўныя поспехі апраўдваюць мэтанапраўленасць ладжання спартыўных мерапрыемстваў Павятовым школьным спартыўным саюзам ува ўсіх школах павета.

Спартыўная дзейнасць у Белліцэі

У II Агульнаадукацыйным ліцэі імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім дзейнічае вучнёўскі спартыўны клуб „Пагоня", які ў 2003 годзе дабіўся наступных поспехаў:

— выхад дзяўчат у фінал Ваяводскай лёгкаатлетычнай ліцэліяды;

— павятовае першынство хлопцаў у кросавай эстафеце 10х1000 метраў;

— перамога дзяўчат у камандным чэмпіянаце павета па шахматах;

— 22 месца дзяўчат і 16 месца хлопцаў у кросавым камандным чэмпіянаце ваяводства.

Міхал Мінцэвіч

Нараўка: конкурс „Залатыя рукі"

Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы запрашае да ўдзелу ў конкурсе „Залатыя рукі" жыхароў гэтай гміны, якія прафесійна або аматарска займаюцца выдумваннем і канструяваннем розных прылад, абсталявання ды прадметаў хатняй абстаноўкі. Словам — усяго таго, што аблягчала б працу ў кухні ды ўвогуле дамашнія працы.

Кожны ўдзельнік можа прапанаваць адну і больш прац. Конкурсная камісія пры ацэнцы будзе браць пад увагу арыгінальнасць і вынаходлівасць конкурсных прац. Да 1 мая 2004 года чакае іх Нараўчанскі гмінны асяродак культуры. Вынікі будуць аб'яўлены 3 мая г.г. За дэталёвай інфармацыяй можна звяртацца ў ГАК у Нараўцы. (яц)

Ненармальным было б, калі б тысячы падаткаплацельшчыкаў ездзілі некалькі дзесяткаў кіламетраў да некалькіх дзесяткаў работнікаў, каб аддаць у якасці падаткаў цяжка заробленыя грошы

Казначэйская ўстанова ў Гайнаўцы

У час афіцыйнага адкрыцця ўстановы прысутнічалі (на першым плане, справа) падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі, бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк, намеснік міністра фінансаў Веслаў Цясельскі, гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук і Януш Пэнчкоўскі (злева), выконваючы абавязкі начальніка Казначэйскай установы ў Гайнаўцы

Казначэйская ўстанова ў Гайнаўцы, якой афіцыйнае адкрыццё адбылося ў канцы студзеня, мае вялікі шанц на развіццё. Пераняла яна больш за 40% патэнцыялу Бельскай казначэйскай установы. На работу ў Гайнаўку будуць прыязджаць 24 асобы, якія раней працавалі ў Бельску-Падляшскім. Апошнія 4 работнікі прыняты з Гайнаўшчыны.

Ужо ў 2003 годзе ў Гайнаўцы існаваў аддзел Бельскай казначэйскай установы, у які падаткаплацельшчыкі здавалі дакументы. Казначэйская ўстанова, якая змяшчаецца ў будынку Гайнаўскага аддзялення Усеагульнага крэдытнага банка па вуліцы 3 Мая, пачала працаваць з 5 студзеня.

— Для большасці працаўнікоў ускладніліся ўмовы працы, бо вымушаны яны даязджаць з Бельска ў Гайнаўку. Аднак ненармальным было б, калі б тысячы падаткаплацельшчыкаў ездзілі некалькі дзесяткаў кіламетраў да некалькіх дзесяткаў работнікаў, каб аддаць у якасці падаткаў цяжка заробленыя грошы. Цяпер стала нармальна, — заявіў у час афіцыйнага адкрыцця ўстановы намеснік міністра фінансаў Веслаў Цясельскі. Зараз гайнаўская ўстанова абслугоўвае ўсіх падаткаплацельшчыкаў Гайнаўшчыны, якія ўзносы плацяць тэрмінова. Рэвіндыкацыяй падаткаў надалей будзе займацца бельская ўстанова. Дырэктар Казначэйскай палаты ў Беластоку Веслаў Свістак паінфармаваў, што ў будучыні казначэйскую ўстанову плануецца перанесці ў асобны будынак і пашырыць яе дзейнасць.

Аляксей Мароз

Нас не такмала!

Перапіс насельніцтва ад 2002 года паказаў, што беларусаў ў Польшчы не так мала. Беларусамі назвала сябе 48,7 тыс. грамадзян. На самай справе нас значна больш.

У такім далікатным пытанні як нацыянальнасць перапісы бываюць далёка неаб'ектыўнымі. Бачу гэтую неаб'ектыўнасць на прыкладзе маёй Нараўчанскай гміны. Праваслаўнага люду ў гміне добрых 80%, а да беларускасці прызналася звыш 47 працэнтаў. Можна меркаваць, што 30% мясцовых беларусаў дасканала заканспіравалася, бо не думаю, што яны апалячыліся.

Мабыць, гэтыя мае землякі пабаяліся, каб іх не перасялілі ў Рэспубліку Беларусь. Невялікі адносна лік беларусаў у гарадах таксама сведчыць аб суб'ектыўнай канспірацыі. Калі ў краіне панує велізарнае беспрацоўе, то выгадней чалавеку прывязацца да польскай большасці. Чаго добрага, а неталерантны прадпрымальнік возьме звольніць з працы рабочага за няпольскае паходжанне і нічога яму не зробіш.

Не запісаліся беларусамі рассеяныя па Польшчы выхадцы з усходняй Беласточчыны. Так паступіла і мая сястра, якая многа гадоў жыве ў Ілаве за Ольштынам. Яна ў сваім горадзе спатыкае ўкраінцаў, але ніколі не сустрэла там ніводнага беларуса. Здзіўляе вялікая колькасць немцаў у Польшчы. Ніколі я не думаў, што ў нас асталося 150 тысяч людзей нямецкага паходжання. А можа і яны не ўсе шчыра прызналіся. Тады нічога дзіўнага, што нямецкая меншасць мае сваіх паслоў у парламенце.

Здзіўляе таксама малы лік яўрэяў — толькі 1,1 тысяча. Не так даўно можна было пачуць, што яўрэяў у Польшчы 10 тысяч. Навінкай з'яўляецца 170 тысяч сілезцаў, якія не лічаць сябе палякамі, а асобнай нацыяй. Калі сілезцы захочуць аўтаноміі, то Польшча можа мець з імі немалыя клопаты.

Мікалай Варанецкі

Адсутнасць публіцыстыкі

Ад некалькіх апошніх выданняў „Ніва" пашырыла паласу для публіцыстыкі. Да пастаянных ужо фельетонаў Яўгена Мірановіча і Мацея Халадоўскага прылучыўся сваім пяром і думкай Яўген Вапа, што мяне асабіста вельмі цешыць. Бо як не кажы, але што думае і як бачыць беларускую, тут і цяпер, рэчаіснасць, цікавіць не толькі мяне, але і большы круг чытачоў.

Мацей Халадоўскі глядзіць на беларусаў „вачыма паляка", і быццам яднае нас з палякамі, бо тое, што палякі не чытаюць „Нівы", вядома. Ну, можа апрача праваслаўных палякаў, якія робяць гэта ў куточку, скрытна. Адным словам Халадоўскі піша пра вялікую палітыку. Пра вялікую палітыку піша ад часу да часу Яўген Мірановіч.

Думаю, што адной з прычын паражэння беларускіх выбарчых камітэтаў ёсць адсутнасць нашай беларускай публіцыстыкі ў грамадскасці, ці то вясковай, ці то гарадской. Быць сабою замала, каб узварушыць грамадскасць і прыцягнуць да ідэі, што беларусы ў Польшчы гэта не праваслаўныя палякі, а будучыя грамадзяне Еўропы.

Шкада, што пакаленне БАСу рассыпалася па розных кутках рэчаіснасці. Адны займаюцца бізнесам, другія навуковай працай, яшчэ іншыя невядома чым, не відаць іх і не чуваць. Шкада, бо то не хто іншы, але інтэлектуальная эліта творыць прагрэс. Пэўна, можна сказаць, што з тым не так ужо і кепска. Усё ж 50 тысяч беларусаў у Польшчы не адцуралася ад сваёй нацыянальнасці. І гэта як бы заслуга і БГКТ і БАС (існуе), „Нівы" і „Часопіса", беларускіх выбарчых камітэтаў і саюза беларускіх арганізацый, беларускай мовы ў школах і настаўнікаў-беларусістаў, і многіх-многіх дзеячаў, ананімных адзінак. Аднак усё гэта не так. Бракуе, проста, матэрыяльнай базы для існавання і развіцця, перад усім культуры. Базы, якой не меў хто стварыць, можа і быў хтосьці, але проста не ўмеў. Калі б была база, не трэба было б Сакрату Яновічу хадайнічаць за грашыма, каб выдаць „Год Беларускі", ці арганізаваць беларускі трыялог. База — гэта калі ласка, радыё „Рацыя". База — гэта сваё выдавецтва, інстытут культуры і многае іншае. І падумаць толькі, што калі б беларус думаў як беларус, то маючы ўладу, прынамсі ў гмінах, паветах, гарадах і мястэчках усходняй Беласточчыны ствараў бы базу для развіцця сваёй культуры, узбагачаючы не толькі беларускую культуру але і польскую, паколькі жывем мы тут, у Польшчы.

Можа яшчэ зарана чакаць водгукаў праваслаўных слугаў божых на крытычныя словы Я. Вапы („Ніва", № 1 ад 4.01.04) у справе навучання праваслаўнай рэлігіі, ці ў справе розных тэрмінаў святкавання Хрыстовага Нараджэння ў розных раёнах Польшчы. Калі бацюшка з пропаведдзю звяртаецца да прыхаджан папольску, гэта гучыць чужа і царква становіцца, як бы не маёй святыняй, дзе ад самых маладых гадоў чуў мову бліжэйшую маёй душы, чым польская мова. Не разумею праваслаўнага духавенства, вядома што не ўсяго, але ў большасці, калі падсякае галлю, на якой сядзіць, калі апалячвае беларусаў, якія складаюць большасць праваслаўнага насельніцтва Польшчы.

У фельетоне „Цягнікі знікаюць з людзьмі" („Ніва", № 52 ад 28.12.03 г.) Я. Вапа кранае вельмі важную справу існавання чыгункі ва ўсходнім кутку Беласточчыны. Загаловак фельетона спалучае з сабой знікненне чыгункі з выміраннем беларускіх вёсак, хаця гэта не зусім так. Многія былыя пасажыры цягнікоў пераселіся на машыны, а старыкі, дзеля якіх нібыта мелі б ездзіць цягнікі, нават аўтобусамі ўжо не ездзяць. Не тая сіла і здароўе, каб тэпаць да цягніка і з цягніка. Як даехаць да доктара? — А не ласка, каб доктар даехаў у вёску!? Ці гэта вялікая фанабэрыя з яго боку? Праўду піша Я. Вапа, што „нам, адцятым ад камунікацыйных шляхоў, інфраструктурна недаінвеставаным, не дачакацца інвестыцый, мо хіба, ласкава сацыяльнай дапамогі". Але дарожныя камунікацыйныя шляхі, не такія ўжо і кепскія. Трэба спытаць ці чыгуначныя шляхі да інвестыцыйнага развіцця неабходныя. Затое напэўна, існаванне чыгуначнай сеткі развіццю турызму пасадзейнічала б. Ёсць адказныя (?) чыноўнікі, палітыкі за развіццё рэгіёна. Трэба спытаць, што робяць у тым напрамку і іншыя. А калі нічога не робяць, значыць, гэта вада на млын праграмы Беларускага выбарчага камітэта.

Міхась Куптэль

Капэла „Забузакі", якая штодзень спявае польскія народныя песні, паказала, што беларускі рэпертуар ёй зусім не чужы

Фестываль пачаўся ў Сямятычах

— У нас многа людзей, якія любяць слухаць беларускія песні, — усміхаецца Язэп Карпюк, — але каб нешта стварыць, самім выйсці на сцэну, о то-то не!

Доказам ягоных слоў быў інаўгурацыйны канцэрт XI Агульнапольскага фестывалю беларускай песні 2004, які прайшоў 24 студзеня ў Сямятыцкім асяродку культуры. У конкурсе, які меў на мэце адабраць найлепшых выканаўцаў беларускай песні ў Сямятыцкім павеце, прынялі ўдзел толькі Язэп Карпюк і капэла „Забузакі". Не было нават патрэбы ацэньваць мастацкі ўзровень спеву.

— Я думаю, што вы, шаноўная сямятыцкая публіка, найлепшае журы, — кампліментавала прыбылых на канцэрт Валянціна Ласкевіч, сакратар ГП БГКТ. — Скажыце, ці гэтыя выканаўцы заслужылі на тое, каб рэпрэзентаваць вас на цэнтральным аглядзе ў Беластоку?

У адказ пасыпаліся воплескі.

Ці варта арганізаваць конкурсы беларускай песні ў месцах, дзе загадзя вядома, што няма для каго (у мінулым годзе ў Сямятычах спявалі: Карпюк, дуэт з Мельніка і папсовы гурт *The Best*)?

— Мы, як Беларускае таварыства, — кажа старшыня Ян Сычэўскі, — ставім сабе за мэту дайсці з беларускай песняй усюды, дзе жывуць беларусы. Абуджаем таксама зацікаўленне нашай культурай палякаў. Прыкладам гэтаму капэла „Забузакі", якая ўпершыню выступіла з беларускім рэпертуарам.


Фота РАМАНА ВАСІЛЮКА

Язэп Карпюк — аўтар слоў і музыкі да сваіх песень

Капэла паказала, што, хаця штодзень спявае польскія народныя песні, то беларускі рэпертуар ёй не чужы. Пасля дзвюх конкурсных песень, па жаданні публікі, музыканты праспявалі яшэ дзве. І толькі тады на сцэну ўвайшоў госць з Беларусі: калектыў „Медуніца" са Шчучына. Канцэрт працягваўся з гадзіну. На вялікае задавальненне сямятычан, якія рэдка маюць магчымасць сустрэцца з жывой беларускай песняй.

М. В.

Цана дапамогі

Напрыканцы 2003 года страйкавалі мундзірныя службы — паліцыянты, ахоўнікі дзяржаўнай мяжы, таможнікі, пажарнікі і ўсе яны хацелі павышэння заработнай платы ды лепшага забеспячэння іхных месцаў працы. І гэта ўсё праўда, бо калі працаўнік добра забяспечаны, дык і выдатней працуе. Але, мне здаецца, паліцыянту сорамна прызнавацца да таго, што ён ідзе ў бюро сацыяльнай дапамогі з просьбай атрымаць якую-небудзь падачку на ўтрыманне сваёй сям'і.

Асабіста ведаю многа сем'яў, у якіх працуе толькі адзін чалавек, за 600-700 зл. у месяц і мае на ўтрыманні жонку, без шанцаў на якую-колечы працу, бо ёй ужо за... сорак гадоў, ды чацвёра дзетак-школьнікаў. І мусяць яны пражыць за тыя сціплыя грошы — пракарміцца, купіць дзецям кніжкі, сшыткі ды месячныя аўтобусныя білеты, каб маглі даязджаць у школу ў Беласток.

Ніколі не было чуваць, каб страйкавалі добраахвотныя пажарныя каманды, а яны часта вымушаны пакідаць сваю працу, каб ратаваць людзей у няшчасці. Цяпер шмат якія вясковыя пажарныя каманды ўключылі ў дзяржаўную сістэму выратавання і яны ў любую пару дня і ночы выязджаюць да рознага роду няшчасцяў. Пажарнікі неаднойчы з наражэннем свайго здароўя і жыцця ратуюць людзей, прыватную, каператыўную і дзяржаўную маёмасць. Калі б не пажарнікі-добраахвотнікі, дык намнога больш было б патрат у дзяржаве.

У цяжкі пасляваенны перыяд, калі падполле паліла вёскі, пастарункі міліцыі, гмінныя камітэты, тады пажарнікі-добраахвотнікі спяшалі з дапамогай. Здаралася і так, што некаторыя не вярталіся жывымі, іх прывозілі дамоў мёртвымі.

Цяпер і падпольшчыкі, і мундзірныя службы з тых часоў дабіліся звання ветэранаў і ветэранскіх правоў, толькі члены добраахвотных пажарных каманд не маюць аніякіх льгот і няма каму за імі заступіцца.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Вачыма паляка

Усходні маштаб — Беларусь

З увагай выслухаў я сеймавае выступленне міністра замежных спраў Владзімежа Цімашэвіча, якое датычыла сёлетняй замежнай палітыкі польскага ўрада. Не скрываю, што чакаў я ў асноўным матываў, якія датычылі б польска-беларускіх адносін. Не здзівіла мяне, што перш за ўсё міністр Цімашэвіч засяродзіўся на праблемах звязаных з уваходам у Еўрасаюз ды, як гэта акрэсліў, блізкімі рэляцыямі з ЗША. Паставіў, аднак, істотнае пытанне: „якія ёсць, і якія мы хочам каб былі нашы месца і роля ў змяняючайся Еўропе". А пасля: „Еўрасаюз павінен мець супольную канцэпцыю рэгіянальнага супрацоўніцтва на Усходзе Еўропы. Гэту ідэю дапаўнялі б двухбаковыя праграмы, а, што важнейшае, служылі б яны росту стабільнасці на гэтым абшары".

Шэф польскай дыпламатыі ўжо ў гэтай частцы выступлення выслаў сігнал, што ўрад, на ўздыме майскай еўрасаюзнай сукцэсіі, не будзе недаацэньваць усходніх суседзяў, прытым у першую чаргу, як звычайна пералічваюць ягоныя прадстаўнікі, Расію, Украіну і Беларусь. Гэта суцяшае. Але што з гэтай Беларуссю — стаў я пытаць сам сябе, папіваючы апошні глыток кавы перад тэлевізарам. Урэшце пачуў больш канкрэтнае, а менш дэкларатыўнае і памяркоўнае: „Нашай палітыцы ў адносінах да Беларусі прысвечваць будзе мэта ўзмацнняння яе незалежнасці і суб'ектнасці ў міжнародных структурах, а таксама падтрымка адкрытага грамадства. Будзем старацца шырэй выкарыстоўваць магчымасці, якія для рэалізацыі гэтых мэт ствараюць партнёрскія праграмы НАТА і ЕС". Пад канец зазначыў: „Будзем хадайнічаць за расшырэнне міжнароднай сістэмы правоў чалавека", якая — на яго думку — пагражае м.інш. блакаваннем гаспадарча-грамадскага развою. Прытым прадказаў таксама „назіранне і бягучае дасканаленне візавых працэдур у аносінах да Беларусі, Украіны і Расіі". Што цікава, пералічыў іх у такой чарзе.

Што з гэтага можа вынікаць, што зменіцца? — зноў паставіў я пытанне, заварваючы другую каву. Мабыць, няшмат. Суадносіны з Беларуссю, таксама і для Польшчы, у еўрсаюзным годзе застануцца без змен. Як было і летась, прадстаўнікі абодвух урадаў можа і будуць сустракацца, а нават абменяцца некалькімі сказамі, але неафіцыйна, без абавязацельстваў. Актывізавацца затое павінны ўлады прыгранічных гарадоў і рэгіёнаў, бо, як дагэтуль, па-за дэкларацыямі аб супрацоўніцтве мала што вынікае з гэтага суседства (апрача, вядома, прыгранічнага „турыстычнага" гандлю). Дарэчы, міністр Цімашэвіч у сеймавым выступленні падкінуў такі вось варыянт: „Вялікую ўвагу надаем супрацоўніцтву з лакальнымі самаўрадавымі структурамі, якія найбольш арыентуюцца ў глыбінцы, што дазваляе ім, супольна з МЗС, паспяхова раэлізаваць намечаныя заданні, таксама ў рамках міжнароднага супрацоўніцтва". Да таго, думаю, што польскі ўрад будзе сачыць за становішчам Масквы ў адносінах да Мінска, якое здаецца быць усё больш рашучым, што чуецца хоць бы ў апошніх гуканнях Крамля ў справе даўгоў Беларусі за газ. Пачакае, ці Мінск памякчэе, ці, як кажа моладзь, стане акунём, нават калі быў бы гэта самазабойчы жэст. Магчымай палітыкай вычэквання крыху непакоіўся ў сеймавай дэбаце на тэму справаздачы Владзімежа Цімашэвіча Ежы Яскерня з СЛД. Намякаў, што, мабыць, Польшча не павінна ўдзельнічаць у астракізме, ізаляванні еўрапейскімі структурамі Беларусі. Хоць гэтага не выказаў, ягоныя словы гучалі так, быццам бы патрабаваў (урэшце ж ад імя кіруючага клуба, роднага клуба міністра Цімашэвіча) большага адкрыцця і большай актыўнасці ў адносінах да ўсходняй суседкі.

З выступлення шэфа польскага МЗС не вельмі я зразумеў тую сёлетнюю мэту аб „umacnianiu podmiotowości" Беларусі ў міжнародных структурах. Як дасюль, нягледзячы на (нешматлікія) усмешкі прадстаўнікоў адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі да міжнародных арганізацый, такіх як Савет Еўропы, іх становішча не памянялася, надалей яно халоднае. Інакш не будзе, пакуль элементарныя дэмакратычныя прынцыпы Беларусь не пачне выконваць. А Польшча ў гэтым, пэўна, не паможа, бо толькі ў руках Масквы ёсць аргументы, вось, як той газ, значыць, магчымасць завінціць кран, а затым, спыніць працу беларускіх прадпрыемстваў. І не мусіць Крэмль турбавацца якраз за грошы за той газ.

Пакуль што, можна цешыцца, што сёлета Беларусь прабілася да адной з міжнародных „структур". Яе прадстаўнік будзе першы раз спяваць на песенным фестывалі Еўрабачання ў Турцыі, м.інш. побач з польскім гуртом „Blue Cafe". Што цікава, Беларусь у Еўрабачанні апынулася хутчэй, чым Украіна. Чаму? Адкуль мне ведаць? Можа, чарговая кава азорыць мяне на гэты конт.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Мне здаецца, што гайнаўскія чыноўнікі „выстругалі" сапраўдную „ліпу"

Ліпная работа

На вясковым сходзе ў Кузаве ў час сустрэчы з войтам тры гады таму была прад'яўлена прапанова добраўпарадкаваць вуліцу, г.зн. абрэзаць верхавіны раскідзістых ліпаў. Кузаўцы іх засаджвалі ў 1970-х гадах у рамках грамадскага пачыну дзеля ўпрыгожання вёскі. За ліпамі ніхто не наглядаў. Выраслі так велізарныя, што пагражаюць не толькі аварыяй электрычнай ці тэлефоннай ліній, але даху дома. Так справа ў маім выпадку маецца. Пасля сходу я яшчэ раз ставіў справу ў чаромхаўскай гміне. Сказалі пісаць заяву. Напісаў. Прыехала камісія. Аглядалі ліпы. У адказ напісалі, што нельга абрэзаць верхавіну дрэва, бо яно засохне. Амаль жа ў тым часе Рада гміны ў Чаромсе выдала дазвол зрэзаць чатыры ліпы (2001 г.) пры кузаўскай вуліцы. Гэту работу мела выканаць Павятовае праўленне публічных дарог у Гайнаўцы.

У верасні мінулага года я прасіў дапамогі ў гайнаўскага старосты. Які вынік? Наступнага дня з'явіўся ў маёй хаце прадстаўнік Праўлення публічных дарог у Гайнаўцы. Паколькі я адсутнічаў, дык у размове з жонкай ён заявіў, што ліпы будуць абрэзаны позняй восенню. У снежні я ўгледзеў аўтамабіль побач маёй сядзібы, з якога выйшлі мужчына з жанчынай. Аглядалі ліпы, трымаўшы ў руках нейкія паперы, затым ад'ехалі. Аб чым размаўлялі, мне невядома.

У пачатках студзеня завітаў я ў Гмінную ўправу. У час размовы з войтам намякнуў аб сваім прашэнні і праблеме з ліпай, якая звісае над домам і нішчыць дах.

— Дык яшчэ справа неўпарадкаваная? — здзівіўся суразмоўца.

— Абяцалі, але не зрабілі, бо ў Праўленні публічных дарог няма грошай, — адказваю.

Кіраўнік гміны папрасіў чыноўніцу і загадаў высветліць справу.

Аказалася, быў дадзены дазвол зрэзаць чатыры ліпы пры кузаўскай вуліцы.

— Але ж яны растуць, — тлумачу, — можна праверыць...

— Дык прачытайце самі, — гаворыць пані Крыся.

Калі я глянуў на службовы ліст, дык прачытаў, што ліпы зрэзаны (чатыры пры сядзібе № 5, тры і чацвёртая пры сядзібе № 8).

— Гэта брат жыве пад № 5, — заяўляю.

— Там фактычна ліпы зрэзаныя, — значыць, усё згодна, — кідае войт.

Мне адно незразумелае ў гэтай справе. Чаму аднаму даецца дабро на высечку дрэва, а другому нельга нават яго падрэзаць, бо ліпа засохне? Мне здаецца, што гайнаўскія чыноўнікі „выстругалі" сапраўдную „ліпу" ў вышэйзгаданай справе. Але я аптыміст. Як прад'явіла пані Крыся войту, у плане на бягучы год Павятовае праўленне публічных дарог у Гайнаўцы запісала „зрэзаць ліпу ў Кузаве пры сядзібе № 14", г.зн. маёй. У адным сумняваюся: калі чыноўнікі дарожнай службы задумаюць выканаць рашэнне ў канцы года, дык выявіцца, што зноў не будзе на гэта грошай.

Уладзімір СІДАРУК

Зорка
старонка для дзяцей

Каханне

Каханне гэта доўгае
чаканне
гэта апантанне
галавы
для якога
быццам бы няма асновы
гэта спалучэнне
аднаго з адным
у каханне ідзеш
як у дым

Барбара

Не люблю „Валянцінак”!

„Валянцінкі” — свята кахання і сяброўства вядомае ў нас з канца XX стагоддзя. Свята прыйшло з ЗША і Англіі, дзе мае звыш 200-гадовую традыцыю. Пачаткова ўспрымалася як свята сяброўства — у гэты дзень сябры і прыяцелі заяўлялі пра памяць і сімпатыю.

Як успрымаем „Валянцінкі” сёння? Кожны з нас ведае, што ў гэты дзень можам прызнацца ў каханні, пісаць сардэчныя лісты (абавязкова з чырвоным сэрцайкам), дараваць падарункі і сюрпрызы мілым нам асобам.

— Каханне мяне не цікавіць. Не люблю „Валянцінак”, — адрэзала Патрыцыя Лісіцкая. Хоць наша шасцікласніца злосна скаментавала выказванні сяброў з Аўгустова пра кніжку „Гары Потэр”, шчыра заявіла:

— Для мяне 14 лютага гэта самы стрэсуючы дзень у годзе.

— Чаму?

— Не люблю гэтага свята, бо не атрымліваю ні „валянцінак”, ні цацак, ні кветак. Калі бачу, як мой сябра Мацей, які кожны год вяртаецца дахаты з мяшком падарункаў і „валянцінак”, мне хочацца плакаць. Чаму мяне ніхто не кахае?

Я хачу, каб у маёй школе не было такога свята! І не адна я. Ведаю дзяўчат і хлопцаў, якія, як і я, перажываюць прыгнятальны стрэс і хваляванне. У гэты дзень, замест смяяцца, мы равем як сірэны.

Патрыцыя на суцяшэнне ўсім неабдараваным кажа:

— Нічога, не будзем сумаваць, „валянцінкі” гэта не ўсё што нас чакае ў жыцці...

Праўда, дарагія сябры, аднак не забывайце пра сваіх сяброў і прыяцеляў, сяброўства не патрабуе вялікіх падарункаў і прызнанняў. Хопіць, што пойдзеце разам на лыжы або пагуляеце ў снежкі. Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Малгося і Лукаш

„Валянцінкі” ў Беларусі

Дзень святога Валянціна ў Беларусі святкуюць каля 10 гадоў. Свята гэтае неяк нечакана з'явілася сярод іншых рэлігійных і свецкіх „чырвоных” дзён.

Найбольшай адметнасцю Дня Валянціна ў Беларусі, як і ў большасці краін, дасыланне „валянцінак”. Невялікія карткі ў выглядзе сэрцайкаў дораць адзін аднаму закаханыя. З гэтага калісьці ў краіну прыйшло свята, але на адных „валянцінках” не засталося. У школах і вучылішчах, тэхнікумах і ВНУ, гэта значыць, усюды дзе „канцэнтрацыя” моладзі вельмі высокая, наладжваюцца разнастайныя імпрэзы, асноўнай тэмай якіх — каханне.

Часам Дзень св. Валянціна набывае палітычную афарбоўку. Хлопцы і дзяўчаты з дэмакратычных маладзёжных арганізацый ладзяць на вуліцах нешта накшталт карнавальных маніфестацый, падчас якіх распаўсюджваюць згаданыя „валянцінкі” і заклікаюць да „любові да Беларусі”.

Сёння мала хто ведае кім быў той Вялянцін, які стаўся святым, і чаму гэта адбылося менавіта 14 лютага. Ды і па-сапраўднаму гэта амаль нікога не цікавіць. Галоўнае, што ў свядомасць людзей у Беларусі ўвайшоў вясёлы „разрыўковы” дзень, калі можна напаўжартам, напаўсур'ёз успомніць аб каханні. Тым больш напярэдадні вясны.

Уладзімір Лапцэвіч

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пажаданні на „Валянцінкі”

Давід Анацік з Аўгустова:

— Усім вучням пятага класа жадаю добрай гульні і адпачынку ў час зімовых канікул!

Моніка Каліноўская з Парцава:

— Пяцікласнікам: самых пяцёрак і шасцёрак на паўгоддзе, многа сімпатычных сяброў і прыяцеляў!

Грышка Цар:

— Многа пацалункаў усім дзяўчынкам!

Рафал Сідарук:

— Шчасця і поспехаў. Многа бусі Ані Базылюк.

Патрыцыя Лісіцкая:

— Усім, хто атрымае „валянцінку” — каб на працягу года сустрэла іх нешта лепшае!

Закаханы дашкольнік

Ці можна закахацца, быўшы ў дзіцячым садку? Чаму ж і не — як кажуць, „любові ўсе ўзросты падуладны”. А калі нахлынуць пачуцці, дык і расказаць хочацца камусьці пра аб'ект кахання. Які ён цудоўны, прыгожы, добры, адметны — таму і пачынаем кахаць кагосьці, што абраннік ці абранніца нас чымсьці заваражылі. Калі не расказваеш, не дзелішся пачуццямі з кімсьці, дык стараешся пераліць свае думкі і мроі на лісток паперы. Таму тады паяўляецца шмат паэтаў. Няважна, ці ўдалыя будуць літаратурныя спробы, яны — важныя перш за ўсё для аўтара. Шкада, што тыя творы найчасцей не захоўваюцца. Гэта — самая цудоўная памятка з часу, калі завязваюцца першыя пачуцці ды страсці.

І, вось, адзін хлопчык з беларускага садка закахаўся. Вельмі спадабалася яму Кася. А ці яна яму? Прызнаўся бабулі. А бабуля ў смех: „А ты што, унучачку, уздумаў у свае шэсць гадоў?!” А гэта і не смешна. Кася прыгожая, разумная, рашае задачы з нулявога класа як мала хто... І моцная. Праўда, у гэтым садку дзеці вельмі ветлівыя, але калі б што — ніхто Касі не падскочыць. А ўсе дзяўчаткі быццам больш смелыя ад хлопцаў. А як пачаць размову з Касяй? Яна ж і вышэйшая за яго... Мабыць, на дзяжурстве, будуць разам, неяк трэба пачаць размову...

Прыйшла мама па сыночка ў садок, чакае дзяжурных, каб паклікалі яго з паверха. А дзяжурных няма. Ужо пару мам ды бабуль стаіць, і дзедка адзін, чакаюць, а ніхто не бяжыць з паверха і назад, каб паведаміць, хто прыйшоў па дашкольнікаў. Урэшце з паверха сталі памаленьку спускацца двое дашкальнят, з павязкамі на рукавах „дзяжурны”. І быццам нічога наўкол не існуе. Размаўляюць. Асабліва хлопчык ідзе ашаломлены, трымаецца за парэнчу ўсходаў. І раптам пусціў ся, ухапіў дзяўчынку за ручку. Спалохаўся, пусціў...

— Дзяжурныя! — закрычалі мамы з бабулямі ды дзед Валодзя.

Дзяжурныя апрытомнелі, узяліся за свае абавязкі.

— І як, адважыўся?.. — пацікавілася мама, якая зусім не смяялася з пачуццяў сынка.

— Ага! Мы гутарылі пра „Пакемонаў”!

Міра Лукша

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Усмешка

Шэра і маркотна.
Няма любві, сяброўства, зразумення.
Ёсць прэтэнзіі і папрокі.
Людзі абыякавыя да твайго клопату.
Не хочацца нічога.
А, можа, варта ўсміхнуцца?
Жыццё — цудоўнае,
толькі мы гэтага не бачым...

Анна Іванюк, ПШ у Нарве

* * *

Я так хацела быць блізка цябе,
а цябе няма. Ці варта жыць?
Без кахання?
Без цяпла?
Без сонца?
Без вясны,
салаўёў і пахучага бэзу?
А дзе ж рамантызм?
Дзе Рамэо і Джульета?
Дзе Трыстан і Ізольда?
Дзе Абеляр і Гэлаіза?
Дзе Арфей і Еўрыдыка?
Можа яны толькі на старонках
Кніжак...

Анна Герман, Ягаднікі

Дзіўная з'ява

Сама ўжо не ведаю, што гэта:
Захапленне ці жэст?
Што гэта такое?
Адкуль узялося?
Чаму авалодала мною?
Хаця часам злуюся на ўсіх,
Пачуццё гэтае прамінае ўміг,
Калі толькі ўбачу яго твар,
Калі зрок павядзе на мяне,
У галаве маю тысячу мар,
А перад вачыма хлопцаў,
Якія чакаюць мяне.
Я доўга так вытрымаць не магу,
І хаця ведаю, што ён зводзіць сяброўку маю.
І часта робіць рэчы дзіўныя,
Але яго вочы прыгожыя такія.
Хачу, каб глядзелі толькі на мяне
І хіба скажу яму: Кахаю цябе!

Малгажата Ахрымюк, ПШ у Нарве

Сябры з бельскай „тройкі" у час зімовых канікул гуляюць у тэатр

Шанц на сяброўства

Даражэнькія! Наша газета вядомая ў Польшчы і Беларусі. На старонках „Зоркі" мы друкуем допісы і апавяданні дзяцей з Беларусі. Вось, нядаўна нам напісала Наташа Рамейка з Нарачы, цудоўнай мясціны над „беларускім морам", як завуць возера Нарач. У „Зорках" №№ 35, 47 за 2003 г. мы надрукавалі яе апавяданні „Асінка і ветрык" ды „Гарывада".

Вось, фрагмент яе ліста:

Дзякуй за публікацыю ў вашай газеце. Я з цікавасцю прачытала вашу газету і дала яе сяброўкам. І ў нас узнікла жаданне наладзіць сяброўскія адносіны з аднагодкамі з Беласточчыны. Я вучуся ў 9 „а" класе (наш 3 клас гімназіі), *удзельнічаю ў розных конкурсах. Мой любімы прадмет — біялогія.*

Тых, каго цікавяць сяброўскія кантакты з моладдзю з Нарачы, просім пісаць на адрас Наташы: Беларусь, 222395 Мінская вобл., Мядзельскі раён, п/о сан. Нарач, вул. Кастрычніцкая 3-37, Наташы Рамейцы.

Смачны і здаровы

Дарагая „Зорка"! Напішу Табе як у маёй хаце пячэцца хлеб. Найперш трэба падрыхтаваць жытнюю муку. Дзень да пячэння хлеба мама робіць заквас: паўкілаграма мукі заліваe кіпетнем, вымешвае, выкладае гэткую сумесь у дзежку, дадае вады і стаўляе дзежку ў цёплае месца. Закваска стаіць да той пары, пакуль стане кіслай. Далей робіць рошчыну. Да закваскі трэба дадаць муку, крыху дражджэй, вымясіць і паставіць у цёплае месца, пакуль цеста добра выхадзіцца. Каб замясіць хлеб, трэба дадаць солі, крышку цукру і адпаведную колькасць мукі. Мясіць датуль, пакуль цеста не пачне адыходзіць ад рук. На замешаным цесце мама робіць знак крыжа, каб хлеб быў добры і яго ніколі не бракавала. Калі цеста добра вырасце ў дзежцы, мама рыхтуе бляшкі і распальвае ў печы. Цеста перакладае з дзежкі ў бляшкі і чакае пакуль хлеб у бляшках падыдзе, а ў печы выгарыць. Жар выгартае кацюбой. Бляшкі засоўвае ў печ. У час, калі хлеб пячэцца, па хаце нясецца прыемны пах. Пасля больш гадзіны мама дастае з печы хлеб. Кладзе на стол, верх хлеба шмарує саланінаю, прыкрывае настольніцай — каб быў мяккі.

Уся сям'я вельмі любіць свой хлеб. Ён смачны і здаровы.

Бася з Катоўкі, V клас ПШ у Дубінах

Мае святы

Свята Каляд я правяла з сям'ёй. У нас на Куццю было многа страў: рыба, борш з грыбамі, хлеб, піражкі, селядцы, шчолак, куцця. Раней мы з братам упрыгожылі ёлку. Яна выглядала вельмі стройнай. Пасля вячэры я з мамай, татам і братам разглядалі падарункі.

На першы дзень Каляд да нас прыйшлі калядзікі з гвяздай і спявалі калядкі. У гэтым годзе было многа калядзікаў. Прыемна прайшлі гэтыя святы.

Наталля Петручук, V кл.
ПШ у Дубінах

Хлеб і аладкі ў бабулі Ніны

Наш клас пабываў на экскурсіі ў бабулі Ніны Яноўскай, якая жыве ў вёсцы Пераходы. Мы знаёміліся, як бабуля Ніна пячэ хлеб. Спачатку трэба замясіць цеста і паставіць, каб яно вырасла ў дзежцы. Пасля выкласці ў бляхі — там хлеб яшчэ раз падыходзіць. Трэба моцна напаліць печ, выгарнуць жар і пасадзіць хлеб у печ. Пячэцца хлеб паўтары гадзіны.

Мы не толькі назіралі за пячэннем хлеба, гаспадыня пачаставала нас смачнымі аладкамі.

Моніка Сямёнчык, V кл.
ПШ у Дубінах

Польска-беларуская крыжаванка № 6

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 2: клас, як, кніжка, нос, аўто, торт, банк, анёл. Кніга, акно, ліст, паж, скарб, аўтар, кропка.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Уршуля Барташук**, **Дарота Праховіч** і **Агнешка Андраюк** з Бельска-Падляшскага, **Дарота Цімашук** з Дубін, **Эва Багроўская** з Дубіч-Царкоўных, **Арак Галёнка** і **Рафал Камароўскі** з Арэшкава, **Эдыта Сухар** з Орлі. Віншуем!

З нагоды сотай гадавіны з дня нараджэння Наталлі Арсенневай рашылі мы вядучай тэмай алімпіяды ўчыніць беларускую эміграцыйную літаратуру, — кажа праф. Аляксандр Баршчэўскі

Алімпіяда пад знакам Наталлі Арсенневай

Акруговыя элімінацыі X выпуску Алімпіяды беларускай мовы, якія адбыліся 21 студзеня 2004 года ў Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, праходзілі пад знакам творчасці беларускіх эміграцыйных пісьменнікаў. Ліцэісты ў пісьмовых працах найчасцей адклікаліся да спадчыны Наталлі Арсенневай, Ларысы Геніюш і Масея Сяднёва. З ліку 53 удзельнікаў акруговых элімінацый 29 вучняў прадстаўлялі Гайнаўскі, а 24 — Бельскі белліцэй.

— З нагоды сотай гадавіны з дня нараджэння Наталлі Арсенневай рашылі мы вядучай тэмай алімпіяды ўчыніць беларускую эміграцыйную літаратуру. У савецкі перыяд эміграцыйных творцаў лічылі здраднікамі і слугамі імперыялізму. Зараз трэба папулярызаваць беларускае эміграцыйнае пісьменства, культуру і літаратуру, — заявіў старшыня конкурснай камісіі прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

Вучням у пісьмовай частцы трэба было зрабіць пераклад тэксту з польскай мовы на беларускую, рашаць граматычныя пытанні і напісаць працу на адну з трох прапанаваных тэм:

1. Мае веды аб беларускай эміграцыйнай пісьмовасці.
2. Галоўныя этапы ў жыцці і творчасці Наталлі Арсенневай.
3. Роля праўды і фікцыі ў мастацкай літаратуры.

У вуснай частцы алімпіяды ліцэісты выцягвалі білеты з пытаннямі пра творчасць беларускіх пісьменнікаў Беларусі, Польшчы і на эміграцыі. Вучні расказвалі таксама пра рэлігійныя святы, сваю сям'ю, сяброў і школу. Арганізатары алімпіяды, якімі былі Аб'яднанне супрацоўніцтва Польшча-Усход і Кафедра беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, дазволілі выбіраць адну з дзвюх змешчаных на білетах тэм.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

За ліцэістаў (на другім плане) перажывалі настаўніцы беларускай мовы з Бельска і Гайнаўкі — Яўгенія Таранта (злева) і Іаланта Грыгарук
Белліцэісты перад вуснымі адказамі

— Расказвала я пра творчасць Максіма Багдановіча. Быў ён маладым паэтам і пісаў для маладых. Падабаецца мне яго наватарства, рамансы і філасофскія вершы, — гаварыла Анна Герасімюк з Гайнаўскага белліцэя. — У пісьмовай рабоце аналізавала я творчасць эміграцыйных пісьменнікаў: Арсенневай, Геніюш і Сяднёва. Звярнула я ўвагу на іх філасофскія і прыродаапісальныя вершы. Падабаецца мне спосаб, у які ўздымалі яны тэму сялянства. Не гаварылі, што вёска бедная і цёмная, але звярталі ўвагу на яе фальклорныя і культурныя аспекты і тужылі па родных мясцінах.

— Самы цяжкі аказаўся пераклад з польскай мовы на беларускую. Лёгка давалася граматыка і творчая праца. Рашыліся мы пісаць пра творчасць Наталлі Арсенневай, бо вучыліся пра эміграцыйную творчасць. У творах Наталлі Арсенневай добрая казачная атмасфера, — сказалі гайнаўскія белліцэісткі Ева Галавачык і Уршуля Вершка.

Для бельскіх ліцэістак Паўліны Попік і Сільвіі Залеўскай самым цяжкім момантам таксама быў пераклад тэксту на беларускую мову. Яны таксама рашыліся пісаць працы пра Наталлю Арсенневу. Анна Манцюк з бельскай школы рашылася выказацца пра фікцыю і праўду, бо любіць пісаць на вольныя і філасофскія тэмы. Барбара Андрасюк з Гайнаўкі пісала пра эміграцыйную беларускую творчасць, бо ў ёй ёсць туга па радзіме і тэмы пра чалавечае шчасце.

Зараз многа вучняў прыступае да алімпіяды беларускай мовы, бо яе пераможцы карыстаюцца вялікімі прывілеямі. Лаўрэаты і фіналісты цэнтральных элімінацый могуць паступаць на многія спецыяльнасці вышэйшых навучальных устаноў без экзамену. Вырашаюць аб гэтым сенаты паасобных ВНУ.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Апавяданне ўладыкі Сімана пра Гогаля было выдатнай хрысціянскай пропаведдзю...

Стымул да задумы

26 студзеня г.г. у беластоцкім Цэнтры праваслаўнай культуры ў рамках Праваслаўнага вучылішча лекцыю на тэму праваслаўя ў творчасці Мікалая Гогаля прачытаў уладыка д-р Сіман Раманчук, архіепіскап Лодзінскі і Познанскі. Дакладчык выдатна даследаваў творчасць выдатных расійскіх пісьменнікаў XIX стагоддзя і з ягоных вуснаў можна было пачуць шмат каштоўных, а мала шырокаму колу людзей вядомых вестак пра гэтага, здавалася б жартоўнага, пісьменніка. Высвятляецца, што ён такім смехатлівым не быў; было з ім акурат наадварот. Ён балюча і з вялікай павагай ставіўся да духовага жыцця ў сваёй краіне — Расійскай імперыі. А да сябе Гогаль быў так патрабавальны, што лічыў сябе недастойным нават стаць манахам, бо меркаваў, што сваімі паводзінамі ён не дапамагаў Хрысту. Гогаль усё жыццё змагаўся з думкамі, перасейваў іх, шукаючы маральнай чысціні. І ўладыкі Сімана апавяданне пра яго было выдатнай хрысціянскай пропаведдзю, ілюстраванай не толькі евангельскімі прыкладамі, але і выказваннямі іншых маральных аўтарытэтаў. „Свет расходуе энергію, займаючыся не тым, для чаго ён створаны, а д'ябла не трэба шукаць далёка, толькі ў тым крэсле, у якім сядзіш". І яшчэ: „наша спадчына, гэта мы, і мы разам з ёю можам адысці ў нябыт". Была гэта важная лекцыя, схіляючая за прыкладам Мікалая Гогаля да глыбокай задумы над сабою.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Спадчына чырвонага прарока

У кожным горадзе Беларусі, на галоўнай яго плошчы, красуецца ўсё яшчэ манументальны помнік бальшавіцкаму правадыру Уладзіміру Ульянаву, больш вядомаму пад псеўданімам Ленін. Пятнаццаць гадоў таму такія помнікі стаялі на ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза і яго зонах уплываў. Пасля прыйшло дэманстрацыйнае развітанне з камунізмам і яго сімваламі. Помнікі Леніну былі найбольш выразнай выявай заангажаванасці грамадства і яго элітаў у ажыццяўленне ўтапічных ідэй у рэальным свеце. З Леніным да гэтага часу не змаглі развітацца толькі жыхары Беларусі і некаторых раёнаў Расійскай Федэрацыі. У выпадку Беларусі зусім невядома чаму ўлады краіны і вялікая частка грамадства лічаць яго надалей сваім прарокам, хаця праўду пра Леніна даўно абнародавалі расійскія і нерасійскія гісторыкі, палітолагі, псіхолагі.

Дзесяткі гадоў савецкая дзяржаўная прапаганда паказвала Леніна як стваральніка новай рэлігіі. Амаль удалося. Пасля вянчання маладыя пары ездзілі з кветкамі пад ягоныя помнікі, каб пакласці іх каля ног скульптуры прарока. Узнікла паталагічная свядомасць, якая выяўлялася ў шчырай удзячнасці для злачынцы. 21 студзеня мінула 80 гадоў з дня смерці Леніна. З гэтай нагоды ў Расіі і іншых рэспубліках выйшлі на вуліцу людзі, якія былі сведкамі зруйнавання святыні прарока вартавымі яго памяці. Расцягнулі яны агульную маёмасць выпрацаваную сотнямі мільёнаў шчырых паклоннікаў прарока і загадалі ім верыць у збавіцельную ролю свабоднага рынку і нейкай дзіўнай палітычнай сістэмы, якую невядома чаму назвалі дэмакратыяй. Дыктатура пралетарыяту стала сродкам акумуляцыі капіталу, дэмакратыя — яго падзелу.

Ленін не любіў імперыі Раманавых, таму што яе не ўзначальваў. Знішчаў яе ўсялякімі даступнымі метадамі і сродкамі. Забойства зняволенага цара Мікалая II і яго сям'і стала сімвалам яго перамогі над імперыяй, якую маскоўскія і расійскія ўладары будавалі амаль пяць стагоддзяў. На руінах расійскай імперыі Ленін вырашыў пачаць будаваць сваю, для ўсяго чалавецтва, якая не мела б межаў, ні ворагаў, давала б дабрабыт і справядлівасць працоўнаму люду нашай планеты. Раней трэба было толькі знішчыць ворагаў прагрэсу, якіх, як аказалася, было ў самой Расіі толькі некалькі мільёнаў.

Ленін імкнуўся ажыццявіць сацыялістычную і марксісцкую ўтопію, асновай якой было перакананне, што каб збудаваць новае, трэба знішчыць ўсё старое. Лозунг свабоды Ульянавым ажыццяўляўся цэнзурай. Адпаведны дэкрэт падпісаў ён 9 лістапада 1917 г., два дні пасля перавароту. Узнікла толькі адна крыніца праўды, усе канкурэнтныя крыніцы знішчаліся разам з людзмі, якія прадстаўлялі іншы пункт гледжання. У параўнанні з ленінскай цэнзурай абмежаванне свабоды слова царскімі ўладамі явілася як вясёлая гульня інтэлігентаў з чыноўнікамі.

Найбольш трагічныя паслядоўнасці народам пад ленінскім, а пасля сталінскім панаваннем, прынёс гаспадарчы авантурызм. Лозунг забраць багатым і раздаць бедным можа і быў добры, калі рэалізаваў яго горскі разбойнік, але ў маштабах вялікай краіны мог толькі прынесці голад мільёнам яе жыхароў. Ленін і ніхто з яго таварышаў не мелі ніякіх канцэпцый гаспадарчага развіцця краіны. Неўзабаве збудавалі яны сістэму, якая няшмат адрознівалася ад прымітыўных форм рабаўладальніцкага ладу. Паспяхова завяршылася толькі пабудова апарату рэпрэсіі і нагляду за грамадствам.

Ленін запачаткаваў таксама новы стыль змагання з палітычнымі і ідэйнымі ворагамі. Недастаткова яму было фізічнай ліквідацыі, патрэбная яшчэ была кампраметацыя, прыніжэнне, абсурднае абвінавачанне ўсіх, якіх лічыў фактычнымі ці патэнцыяльнымі канкурэнтамі. Бальшавікі стварылі таксама новы тып інтэлігенцыі, легіёны канфармістаў, прыстасаванцаў, служакоў пануючай групы. Расійскія эліты, якіх фізічна не знішчылі, выгналі з краіны. Ленін пазбыўся ўсіх, што маглі стварыць альтэрнатыўныя ідэі. Сталін знішчыў першае пакаленне савецкай інтэлігенцыі, якое паспела прысвоіць сабе шмат чаго са старой традыцыі.

Сталін быў найбольш выдатным вучнем Леніна. На пачатку знішчыў усіх таварышаў, якія мелі большыя правы да ленінскай спадчыны. Удасканаліў стыль палітыкі свайго вялікага настаўніка, учыніў яго прарокам, які адкрыў вароты да прыходу на зямлю самога Іосіфа Вісарыёнавіча — Сталіна. Знішчаючы сімвалы хрысціянства Ленін і Сталін будавалі адначасова фундаменты свайго культу, выкарыстоўваючы рэлігійную сімволіку і рыторыку.

Прыглядаючыся практыцы штодзённага жыцця не толькі ў Расіі ці Беларусі, але таксама і ў Польшчы, відаць як моцна ўкаранілася тут ленінская традыцыя. Спадчыну Леніна асабліва відаць у сферы палітыкі, дзейнасці дзяржаўных службаў, успрыманні элітамі канкурэнтных светапоглядаў. Лозунг мінулай эпохі „Ленін вечна жывы", аказваецца, не надта разыходзіцца з праўдай.

Яўген МІРАНОВІЧ

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Мама

Маці нас радзіла і даглядала
І любоў сваю нам даравала
Не забудзем яе мы ніколі
Нават у засценках няволі
Апошнім дзялілася
І да Бога жывога малілася,
Каб мы выйшлі на людзей
Мінавала нас гора і грэх-ліхадзей
Каб не было маці
Павінны мы знаці,
Што свет быў бы пусты
Не было б нас, толькі цемра, камні, кусты...
Але Бог стварыў чалавека
І ён жыве да сённяшняга часу і века
Мама стварае наша патомства
Радзіўся Ісус Хрыстос; каб знікла злосць
і розная помста
Будзем даражыць нашай мамай,
Каб у сэрцы была любоў і не агарчаліся
няўдачай і драмай
Будзем ісці сцежкай Хрыстовай
Мо і цяжкай, крывой, але новай
Маці і жонка — наймілейшы скарб
Даражэй золата варт
Будзем ёю даражыць
Шанаваць, слухацца, таксама любіць
І то шчыра
У яе душы і сэрцы месца спакою і міра
Яна наша апора
Заўсёды пацешыць, калі спасцігне нас гора
Работа нашай мамы складаная
І пахучай розай і дыванам не ўсланая
Яна для нас, мужыкоў, не пад сілы
Будзем даражыць мамай, жонкай,
павер друг мой мілы.

Мікалай Панфілюк

Сусветны заапарк

Крывавае вока ночы ўважліва сочыць
кожны мой рух, кожнае дыханне,
кожнае дрыжэнне павекі, кожнае...
Мой жыццёвы арышт
зняволены ў чатырох сценах свету
кідаюся нібы звер у клетцы
раздзіраю свежыя раны сваёй чалавечнасці
выючы і скуголячы за вяртанне ў пекла
выстаўлены людзям на пасмешышча
адчуваю сябе стомленым жыццём
я — гатунак, які адмірае

Магдаліна Леанчук

Не ўмяшчаўся ў рамкі сацыялістычнай забаўляльнасці, бо і не быў дзіцём сістэмы, толькі паклоннікам наднёманскай тугі

Яго сілай была душа

Пасля цяжкай пухліннай хваробы 17 студзеня г.г. памёр адзін з выдатнейшых польскіх музыкаў, вакаліст, мультыінструменталіст, кампазітар, жывапісец, аўтар Чэслаў Немэн (Выджыцкі). З Беларусі, дзе нарадзіўся, у Польшчу прыехаў дзевятнаццацігодкам у 1958 годзе; прывёз з сабою музыку тамашняй зямлі, вакальныя здольнасці і непаўторны акцэнт. Быў кумірам некалькіх пакаленняў. Неразгаданы, таемны, знячэўкавы, хаця ў яго не экстравагантнасць была сілай, але душа...

Дзіўны гэты свет... Быццам гэта заўсёды было вядома, але толькі ў 1967 годзе сказаў гэта Чэслаў Немэн. Дакладней: драматычна і экспрэсіўна выкрычаў з эстрады Апольскага фестывалю. Не ўмяшчаўся ў рамкі сацыялістычнай забаўляльнасці, бо і не быў дзіцём сістэмы, толькі паклоннікам наднёманскай тугі.



Дзіўны гэты свет

Дзіўны гэты свет,
Дзе ўсё яшчэ
Знойдзем мы многа зла.
І дзіўным гэта ёсць,
Што столькі гадоў
Чалавек у пагардзе.

Дзіўны гэты свет,
Свет людскіх спраў.
Сорам часам прызнацца,
Аднак, часта ёсць так,
Што словам благім
Як нажом забіваюць.

Ды людзей добрай волі
Больш разам,
І моцна веру я,
Што той свет
Не згіне дзякуючы ім.
Не!
Прыйшоў ужо час,
Апошні час
У сабе нянавісць знішчыць.

Пераклад Міры Лукшы

З-за песні „Дзіўны гэты свет" вакол Немэна ўзнялася сапраўдная бура, колькі ж супярэчлівых ацэнак: ад захаплення і эйфарыі да абурэння і непрадуманых крыўдных абмалёвак. Нават частка першых паклоннікаў адступіла, быццам не ўспяваючы за развіццём яго творчых патэнцый. Аднак многія паслядоўна выказваліся на яго старане, з зацікаўленнем наглядаючы за яго штораз новымі творчымі музычнымі выпрабаваннямі. Да адданых фанатаў ягонай эстраднай творчасці залічваю і сваю скромную асобу — маю агромную калекцыю ягоных краёвых і замежных запісаў на разнастайных дысках і магнітафонных стужках, сотні прэсавых артыкулаў сабраных мною на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў, здымкі, аўтографы, кніжкі...

Вось некаторыя вытрымкі з выказванняў Чэслава Немэна, друкаваныя ў сямідзесятыя гады ў музычных часопісах („Non Stop" і інш.):

„Лічу, што мастацтва не можа быць адарванае ад каранёў, але мусіць з іх вырастаць. Я не кампазітар па адукацыі, свае ідэі інтуітыўна чэрпаю з таго, з чаго я вырас, з фальклору. Я нарадзіўся ў Беларусі, 60 кіламетраў ад Гродна (у Старых Васілішках каля Навагрудка — М. М.), дзяцінства правёў у многанацыянальнай вёсцы; заўсёды межаваліся там розныя культуры: польская, беларуская, літоўская, украінская, руская. Мае бацькі спявалі ў вясковым касцельным хоры. Мы, дзеці, збіраліся на вячоркі, дзе спявалі песні, галоўным чынам народныя: рускія, польскія, беларускія, украінскія. У маёй памяці захавалася іх так многа, што ў будучыні хацеў бы іх запісаць, мо на двух-трох дысках (запісаў і выпусціў у ФРГ — М. М.). На маю думку, мне трэба паказаць тое, што істотнае ў народнай музыцы — палымянасць і пачуццё, тое, чым багаты рускія песні, гэтак званую „душу". Гэты песні заўсёды выклікаюць зацікаўленне не толькі сваёй прыгажосцю, але і вялікім эмацыянальным зарадам, душашчыпальнасцю. Менавіта гэта займае мяне найбольш у музыцы.

У Гродне вучыўся я ў музычнай школе, шпацыраваў над Нёманам — я вельмі любіў гэтую рэчку, плывучую ў лагчыне. І з гэтай прыхільнасці ўзяўся мой псеўданім і афіцыйнае прозвішча".

У 1962 годзе Чэслаў Немэн стаў адным з лаўрэатаў І фестывалю маладых талентаў у Шчэціне. Да 1967 года выступаў з калектывам „Niebiesko-Czarni", пасля кіраваў уласнымі ансамблямі „Akwarele", „Niemen Enigmatic" ды гуртамі „Aerolit" і „Niemen". Выступаў сола, іграў джаз. У 1968 годзе, як найбольш вядомы польскі выканаўца, атрымаў прэмію MIDEM у Кан і ўзнагароду амерыканскага тыднёвіка „Billboard". У 1974 годзе адзначаны Залатым крыжам заслугі. Атрымаў таксама ўзнагароду І ступені Старшыні Рады Міністраў за творчыя поспехі ў галіне кампазіцыі і выканання ды шмат-шмат іншых узнагарод і вылучэнняў. Расславіўся ён таксама прамоцыяй музыкаў маладой генерацыі. Для супрацоўніцтва ў ансамблі часта прыцягваў музыкаў з Беластока, напр. Пятра і Ежы Дземскіх.

Сорак цудоўных гадоў на сцэне. Гэта ён пад уласную музыку расспяваў не толькі польскую паэзію, але і Ясеніна, Лермантава, Міхалкова, Маякоўскага, Раджэственскага... Быў вельмі далікатным чалавекам. Задзіўляў тым, што ўмеў існаваць са сваёй мовай і чуллівасцю побач пастаянна мяняючыхся мод і плыняў. Пакінуў багатую музычную спадчыну і ягоная музыка — звышчасовая — будзе трываць.

„Дзіўны гэты свет, дзе ўсё яшчэ знойдзем мы многа зла. І дзіўным гэта ёсць, што столькі гадоў чалавек у пагардзе..."

Міхал Мінцэвіч

Усе фоткі задняга плана **www.vikingsonline.org.uk**

Нарманы ў гісторыі Беларусі

І частка

Андрэй Катлярчук сваёй кніжкай *Шведы ў гісторыі і культуры Беларусі* (Мінск 2002) узнавіў дыскусію аб ролі нарманскага (варажскага) чынніка ў гісторыі нашай краіны. Катлярчук ставіць справу рубам, маўляў, русь гэта варагі і вікінг Рагнвальд стварыў першую гістарычную дзяржаву ў Беларусі і заклаў пачатак дынастыі полацкіх князёў, а іншы вікінг Тур заснаваў Тураўскае княства.

Не буду тут разважаць праблему паходжання назвы русь. Паходжанне гэтай назвы было няяснае нават для г.зв. Нестара, якога пазней назвалі „першым нарманістам". Сусветна вядомы польскі гісторык Генрык Пашкевіч пераканаўча даказаў, што якраз „Нестар" нарманістам не быў, але ж праблема засталася.

Варажская імперыя „ад мора да мора" вядомая выключна з адной крыніцы — *Повести временных лет. Повесть* пісалася паводле яе даследчыкаў некалькі дзесяткаў гадоў, недзе ад сярэдзіны XI ст. да пачатку XII ст. Да нашых часоў дайшла ў дзвюх рэдакцыях — *Лаўрэнцьеўскага летапісу* 1377 г. і *Іпацеўскага* (20-я гг. XV ст.). Да гэтага часу нямала яшчэ можна было дадаць-дапісаць. Хто пісаў *Повесть временных лет* сапраўды не ведаем. Называюцца імёны „Нікана" і „Нестара", але гэта толькі прыдуманыя даследчыкамі літаратурныя крыптанімы. З навуковага пункту гледжання ўсё, што расказваецца ў *Повести временных лет*, а што не мае пацвярджэння ў сапраўдных дакументах — усяго толькі расказы, ды аніяк не гісторыя. Першыя гістарычныя постаці ў *Повести* — Ігар і Вольга (успомненыя візантыйскім аўтарам Канстантынам Багрананосным).

Ігар, відаць, сапраўды быў варагам і заснавальнікам дынастыі. Першы нарманіст — „Нікан" меў задачу даказаць з аднаго боку, што варагі гэта русь (у сапраўднасці руссю маглі называцца і сарматы — дыскусія надалей ідзе ва ўсю), з другога — даўнасць дынастыі. У выніку творчай працы ў *Повести* з'явіліся „бацька" Ігара Рурык (са сваімі „братамі" Сінеусам і Труварам) ды „дзядзька" Алег. Здаўна вядома, што нарманіст „Нікан" ні шведскай, ні ніякай іншай варажскай мовы не ведаў і таму не разумеў, што *sine hus thru varing* па-нарманску значыць „са сваім родам і дружынай". А гэта значыць, што ніякіх Сінеуса і Трувара не было. А вось Рурык дык існаваў сапраўды. Рурык (Roric) ютляндскі быў дацкім каралевічам, заваёўваў двойчы Фрызію і змагаўся з пераменным поспехам за родны трон. На жаль, пра яго подзвігі на ўсходзе маўчыць як гісторыя, так і сагі. Адтуль і гіпотэза, што „Рурык, Сінеус і Трувар" нішто больш як літаратурны сюжэт, уключаны „Нікам" дзеля даказання высакароднасці паходжання Ігара. Рурык быў няўдачны, але ж каралевіч. „Дзядзька" Ігара „Алег" дык, хутчэй за ўсё, наогул не быў варагам, толькі нейкім цюрскім палкаводцам („олгу" гэта на цюрскіх мовах „правадыр дзесяці тысяч мужоў" і гэта таксама добрая гіпотэза, як і выводжанне імя Алег з „вещий", бо руская дзяржава мела форму цюрскага каганата).

Калі не было Рурыка з яго братамі Сінеусам і Труворам, можна засумнявацца таксама ў існаванне Рагвалода з яго братам Турам і дачкой Рагнедай. У сапраўдных дакументах такія не выступаюць.

Я згодны з тымі, якія ўважаюць гэтыя імёны скандынаўскімі. Так лічылі і ў савецкі час. Ёсць у мяне кніжка на казённай маскоўскай мове некага Н. Палянскага *Славен город Полоцк*, у якой чорным па белым напісана, што Рохвольд быў дрэнны вараг, ад якога вызваліў палачанаў добры рускі князь Владимир. Здзіўляе толькі, чаму А. Катлярчук аддае перавагу форме Рангвальд (Rangvald), падчас як правільная форма Рагнвальд (Ragnvald), якую спярша сам прымяніў. Скінем гэта на выдавецкую неахайнасць. Дарэчы, я сам, пішучы гэты тэкст, некалькі разоў напісаў Рангвальд. Відаць, беларусу Рагнвальд не вымавіць. Яшчэ лепш гучыць Рагнвалд і гэтай формы буду трымацца. Недасканалым здаецца мне і адчытанне імя Рагвалодавага брата як Тур (Tor). Тур гэта імя бажаства, а людзям у той час давалі імёны, якія толькі паходзілі ад імя бога. У старэйшым летапісе стаіць не Тур, а Туры.

(працяг будзе)

Алег Латышонак

Я. Іванюк: Ганаруся тым, што кожны дзень прыкладна 250 чалавек заходзіць на „Камунікат", здабываючы для сябе неабходныя веды...

kamunikat.net.iig.pl

Час ад часу варта зазірнуць у бібліятэку, пасядзець у чытальнай зале, пахадзіць паміж стэлажоў з невядомымі да гэтай хвіліны кнігамі, пагартаць зацікавіўшыя цябе выданні. Падобныя пачуцці ўзнікаюць, калі зойдзеш на сайт з цікавай назвай „Камунікат". Бо гэта беларуская Інтэрнэт-бібліятэка.

Уся гісторыя стварэння і існавання сайта пад адрасам **kamunikat.net.iig.pl** непарыўна звязана з Яраславам Іванюком, цяперашнім журналістам Польскага радыё Беласток. З нагоды нашага зацікаўлення ён згадзіўся распавесці аб сайце падрабязней:

— Гісторыя стварэння сайта „Камунікат" узыходзіць да часоў маёй працы ў беларускай службе Радыё Палёнія. Менавіта тады ў 2000 годзе ўзнік яго прабобраз — неафіцыйны бюлетэнь гэтага самага радыё. Ён існаваў у папяровым выглядзе і змяшчаў тое, што праходзіла ў эфіры Палёніі. Пазней узнікла інтэрнэтная версія, якую я пачаў насычаць інфармацыяй аб так званых гістарычных сшытках, а затым і іншых беларускіх кніжках. Хачу адзначыць, што сайт з'явіўся не толькі маімі намаганнямі, але і пры актыўнай дапамозе сакратара рэдакцыі тыднёвіка „Ніва" Аляксандра Максімюка і маёй жонкі Дануты.

— Ці часта „Камунікат" змяняў свой выгляд і дзякуючы чаму адбываюцца яго абнаўленні?

— Двойчы сайт змяняў сваё аблічча. А абнаўляецца ён дзякуючы адпаведнаму стылю работы. Я звяртаюся да розных аўтараў, каб яны дасылалі свае выданні, часам яны дасылаюць па ўласнай ініцыятыве. Абнаўленне адбываецца даволі часта. Пры гэтам хачу адзначыць найбольш актыўных, з кім даводзіцца супрацоўнічаць: Беларускае гістарычнае таварыства, Літаб'яднанне „Белавежа", Villa Sokrates, Беларускі інстытут навукі і мастацтва з Нью-Йорка, Архіў найноўшае гісторыі з Мінска.

— Што ў рабоце сайта выклікае ў цябе найбольшы гонар і чаго, на тваю думку, у ім пакуль не хапае?

— Ганаруся тым, што кожны дзень прыкладна 250 чалавек заходзіць на старонкі „Камунікату", здабываючы для сябе неабходныя веды і інфармацыю аб беларускіх выданнях як даўніх, так і апошніх. А не хапае, лічу, той беларускай літаратуры, якая выдавалася ў Польшчы ў 1959-1989 гадах. Але тут праблема больш фінансавага, чым тэхнічнага плана.

Да ўсяго сказанага Яраславам Іванюком дадам, што „Камунікат" ёсць сапраўднай жамчужынай для тых, хто прагне ведаў аб беларускай даўніне і сучаснасці. Акрамя 250 кніг па гісторыі, мове, літаратуры, палітыцы і гэтак далей, карыстальнік можа адкрыць перад сабой старонкі разнастайных часопісаў. Некаторыя выданні можна выпісаць і мець іх ужо ў рэальнай хатняй бібліятэцы, а не толькі ў віртуальнай наяўнасці.

Уладзімір Лапцэвіч

Аб сустрэчах пасла Беларусі ў Падляшскім ваяводстве Польшчы

Беларусь, беларусы

26 студзеня 2004 года пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка наведаў Музей і цэнтр беларускай культуры ў Гайнаўцы і правёў сустрэчы з новым дырэктарам установы Янам Карпюком. У сустрэчы прынялі таксама ўдзел староста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук, бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк і генеральны консул Беларусі ў Беластоку Леанід Каравайка.

Адбыўся абмен думкамі аб перспектывах стварэння на базе музея ўстановы культуры ў сувязі з увядзеннем на мінулым тыдні будынка і памяшканняў музея ў эксплуатацыю. Згаданае рашэнне дае падставы пацвердзіць заканчэнне будаўніцтва Музея і цэнтра беларускай культуры, ініцыятыва стварэння якога належыць да беларускай грамадскасці ў Польшчы. Фінансавую і іншую дапамогу ў будове музея акрамя беларусаў Польшчы і замежжа аказвалі ўрады БССР, Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Польшча.

Было адзначана, што з будаўнічых прац засталося выкананне агароджы і ўпарадкаванне прылеглай да будынка тэрыторыі. У ходзе сустрэчы абмеркаваны магчымасці аказання дапамогі з беларускага боку пастаўкай цэменту і мармуру для выканання агароджы.

Дасягнута дамоўленасць аб правядзенні вясной 2004 года грамадскага чыну па ўпарадкаванню тэрыторыі музея з удзелам беларускай грамадскасці Беласточчыны, вучняў беларускіх ліцэяў, прадстаўнікоў мясцовых улад і беларускіх дыпламатаў.

У ходзе сустрэчы была падкрэслена неабходнасць апрацавання сумеснага плана дзейнасці ў галіне культуры паміж музеем і ўстановамі культуры Беларусі. Дасягнута дамоўленасць аб правядзенні тыдня беларускага кіно, фотавыставы „Шляхамі Купалы і Коласа", выставы маладых беларускіх мастакоў у музеі ўжо ў першай палове 2004 года. Абмеркаваны перспектывы папаўнення кнігазбору бібліятэкі цэнтра новымі выданнямі з Рэспублікі Беларусь.

Дасягнута дамоўленасць аб стварэнні ў музеі пастаяннай экспазіцыі эканамічных магчымасцей Беларусі і арганізаванні рэгіянальных беларуска-польскіх форумаў і сустрэч.

Музей і цэнтр беларускай культуры ў Гайнаўцы з'яўляецца адзінай падобнага характару ўстановай беларускай культуры па-за заходнімі межамі Беларусі.

Падчас знаходжання ў Падляшскім ваяводстве пасол Беларусі і генеральны консул Беларусі ў Беластоку правялі перамовы з кіраўніцтвам прадпрыемства „Пронар" і прадстаўнікамі ВА МТЗ у Польшчы аб перспектывах і праблемных пытаннях экспарту беларускіх трактароў на польскі рынак. У якасці пазітыўнага фактара быў прыведзены прыклад росту продажу беларускіх трактароў у Польшчы ў мінулым годзе на 40% у параўнанні з 2002 годам.

Падчас знаходжання на Беласточчыне 24-26 студзеня пасол Беларусі таксама правёў сустрэчы з кіраўніцтвам Гайнаўскага і Бельскага ліцеяў з беларускай мовай навучання.

Ад імя Пасольства Беларусі і Генконсульства ў Беластоку ліцэям былі перададзены нацыянальныя атласы Рэспублікі Беларусь, а таксама метадычная літаратура для вывучэння геаграфіі, гісторыі і культуры Беларусі.

Пасольствам Беларусі ў Польшчы пацверджана ўстанаўленне штогадовай каштоўнай узнагароды для лепшых вучняў ліцэяў і гімназій у Гайнаўцы і Бельску-Падляшскім, якія вывучаюць беларускую мову і літаратуру. Адбылося абмеркаванне пытанняў, звязаных з планаваным на верасень 2004 года святкаваннем 60-гадовага юбілею Бельскага ліцэя з беларускай мовай навучання.

Прэс-служба Пасольства РБ у Польшчы

Занатоўкі кантрабандыста

Паліцыянты хабар не бяруць

На пачатку дзевяностых гадоў польскі ўрад нарэшце зразумеў эканамічную мэтазгоднасць абароны свайго рынку. Яны забаранілі масава ўвозіць на сваю тэрыторыю спірт і цыгарэты, а таксама вывозіць адтуль валюту. Беларускія разумнікі адрэагавалі „адэкватна" і зрабілі тое ж самае з дакладнасцю наадварот. Дыпламаваныя эканамісты з міністэрстваў забаранілі вывозіць з Беларусі спірт, і прывозіць да нас валюту. Недыпламаваная грамадскасць была ў шоку. І не толькі ад таго, што прападаў іх асабісты, набываемы цяжкім потам ад нелегальнага гандлю законны заробак. Вельмі было крыўдна за дзяржаву.

Простага мытніка, які трос торбы кантрабандыстаў, зразумець было можна. Яму пасля цяжкой працы, як і ўсім нармальным людзям, таксама хацелася зняць фуражку, дый цяпнуць пляшку. А пазіраючы на аб'ёмы спіртнога, якое перацягвалі суайчыннікі за мяжу, ён баяўся, што да канца ягонай змены вывезуць усё, і прыйдзецца класціся спаць цвярозаму. А вось у чым была логіка дзядзькоў з міністэрстваў, па сённяшні дзень вялікая таямніца.

Здавалася, што польскі рынак стаў самым абароненым у свеце. Пра яго дбалі як палякі, так і беларусы. Праца кантрабандыста стала як ніколі цяжкой, жыццё невыносным.

Гэтая кепская навіна застала нас на Гайнаўскім рынку. Мой калега быў у адчаі. Напіўся спірту, як травеньскі кот валяр'янкі, і ні з кім не хацеў размаўляць. Чалавек ён быў надзвычай скупы. Галоўным яго заняткам было па сто разоў пералічваць нагандляваныя залатоўкі. Я яму за гэта даў мянушку Гольдэн, спалучыўшы англійскае слова golden (золата), з беларускім голь. Гольдэн сваёй мянушкай вельмі ганарыўся, бо не ведаў крыніцаў яе паходжання. Ён, як чалавек практычны, добра ўцяміў, што на адзін заробак пражыць цяжка. Таму акрамя асноўнай працы, гандлю спіртам, падпрацоўваў яшчэ кантрабандай цыгарэтаў „Гольдэн Амерыкан". З таго і лічыў, што мянушка да яго прыклеілася па „прафесійнай" прыкмеце. Мяне гэта вельмі цешыла.

Працверазеўшы, Гольдэн заявіў, што нам трэба ў гэтых цяжкіх умовах мяняць кваліфікацыю, і прапанаваў, каб не рызыкаваць на мяжы, скупляць спірт з цягніка ў Кузніцы, ды валачы яго на яшчэ не „абжытыя" польскія тэрыторыі. Там ён значна даражэйшы. Я пагадзіўся. Бо каб у мяне на мяжы сканфіскавалі бутэльку спірту, то я з тае бяды выпіў бы ўвесь астатні. А ён мог бы і рукі на сябе накласці.

Маю машыну ласкава называлі „жаба". Яна была зялёнай, і ад цяжару наладаванага ў ёй спірту заўсёды паўзла трыбухом па асфальце. На гэты раз „жаба" цягнулася ў бок Астралэнкі. Цямнела. Мы, аб'ехаўшы лясны шлагбаум, і збіўшы бамперам знак, які забараняў уезд у лес, звярнулі на паляну пераначаваць. Замаскаваўшы машыну галлём, мы распалілі невялічкі агеньчык, і адкаркавалі першую літроўку спірту. Ноч была цёплая, ласкавая, як вясковая печ. Спірту ў бутэльцы ўсё меншала. Агеньчык разгараўся і непрыкметна вырас вышэй лесу. Я неяк стараўся давесці свайму кампаньёну, што ў такой сушы можа загарэцца лес. Але ён пярэчыў, сказаўшы што за дровы плаціць не трэба, а вогнішча ў разе чаго спецыяльныя службы патушаць з неба шрубалётамі.

Усё было б добра, каб праз нейкі час за плячамі Гольдэна не выраслі з цемры дзве постаці ў мундзірах польскай паліцыі. Адна постаць нагадвала доктара Ватсана, але паводзіла сябе як Шэрлак Холмс. Другая таксама мела падабенства з Ватсанам, але на лаўры Холмса не прэтэндавала. Я пастараўся папярэдзіць кампаньёна, што да нас падкрадаюцца паліцыянты. Але ён, думаючы, што я жартую гучна крыкнуў:

— Пердоліў я пшыстких паліцыянтаў!

— Каго пан пердоліў?! — зароў першы Ватсан і дастаў пісталет.

Гольдэн падскочыў як апечаны. Першая думка, якая прыйшла ў п'яную галаву, нашэптвала яму, што нас пакараюць за злоўжыванне алкаголем. Што зробіш — савецкае выхаванне. Ён хапіў на вачах аслупянелых паліцыянтаў недапітую бутэльку, і шпурляну яе ў кусты, пры гэтым цвёрда заявіўшы што мы не п'ём.

— То можа вы і вогнішча не паліце? — закрычаў паліцыянт. — Ваш агонь бачны нават з Балтыйскага мора. А ў нас не толькі агонь паліць, у лес заходзіць нельга.

— Ну знайшлі праблему, — пастараўся аджартавацца я. — Упэўнены што балтыйскі флот мае добрых лоцманаў, якія ніколі не зблытаюць наш агеньчык з маяком, і не адхіляцца ад курсу.

Ватсаны жарту не зразумелі, і мне, каб не зацягваць канфлікт, давялося перайсці да канкрэтыкі.

— Мы з калегам трохі грошай угандлявалі, хочам падзяліцца з вамі. — І я палез у кішэню.

— Ты што, нам хабар прапаноўваеш?

— Не маю іншага выйсця! — развёў рукамі я.

— Я таксама, — ажывіўся другі Ватсан, схаваў пісталет і стаў лічыць мае грошы.

Вочы ў паліцыянтаў загарэліся ярчэй нашага вогнішча. Праўда, яны падкрэслілі, што гэта толькі першая залічка. А канчатковую суму скажуць, як праверацъ што ў нас у машыне.

Ні ў якім разе нельга было каб да гэтага дайшло. Там жа, роўненька як снарады, бутэлечка ў бутэлечку быў складзены спірт. Я з усяе сілы павярнуў ключ багажніка ў адваротны бок і наўмысна зламаў яго.

— Ну вось, — кажу, — цяпер машыну не адчыніць. Можа, пакуль я адрамантую замок, вы трохі з намі вып'еце.

— Хіба толькі, каб праверыць што за паскудства вы нам возіце.

„Паскудства" Ватсанам прыйшлося вельмі даспадобы. Пасля першага ж кілішка яны бліжэй падселі да вогнішча і сталі нахвальваць нашае сала, хоць елі толькі каўбасу. Пасля трэцяй чаркі яны ўжо дапамагалі нам збіраць дровы для вогнішча, якое разгарэлася яшчэ больш. Але спірт, які Гольдэн дастаў з кустоў, нечакана для ўсіх, скончыўся хутка. Паліцыянты хітра глянулі на мяне і засумняваліся, што гэта была апошняя бутэлька. Я дастаў другі ключ і падняў крышку багажніка. Бутэлечкі ў святле вогнішча заблішчалі ўсімі колерамі вясёлкі. Адзін з паліцыянтаў выдыхнуў: „О курча". Другі выкрыкнуў тое ж сама, толькі замяніў апошнія літары „ча" на „ва".

Як спірт ужо не лез у горла, вясёлыя Ватсаны, шчыра расцалаваўшы нас на развітанне, пайшлі ў гушчар шукаць сваю машыну. Але не паспелі мы паверыць, што ўсё няблага скончылася, як адзін з іх вярнуўся.

— Паліцыянты хабар не бяруць, — ганарова заявіў ён, сунуў назад нашы грошы, і, то галавой то тулавам спрабуючы на трываласць сосны, знік у цемры. А мы ракам папаўзлі да машыны па чарговую бутэльку, каб адсвяткаваць нечаканы „прыбытак".

Колькі мы не начавалі пазней па лясах, Гольдэн, нават зімой, больш не распальваў вялікага вогнішча. Дровы па-ранейшаму заставаліся дармовымі, а нам прыходзілася мерзнуць.

Сымон НАЛЬШАНСКІ

ШАФРАН ДЫ ПЕРАЦ

Прапануем чытачам, не толькі жаночага полу, кулінарныя рэцэпты. У нашай рубрыцы знойдзеце парады як хутка і смачна зварыць рэгіянальныя стравы, рэцэпты на алкагольныя і ахаладжальныя напоі, салодкія дэсерты і танныя закускі. На добры пачатак прапаную рэцэпты страў на нядзельны абед, якія задаволяць патрабаванні кожнага галоднага мужчыны, а нам не прыдадуць лішняга клопату.

Карэйка з агароднінай

Прапорцыя на чатыры асобы: 1 кілаграм карэйкі (свіной грудзінкі) без косці, соль, пучок размарыну (або ядлоўцу), 2 лыжачкі мёду, мелены перац, 3 цыбуліны, 2 зубкі часнаку, 4 вялікія морквы, 10-15 вялікіх шампіньёнаў, банку памідораў у заліве, 2 сырыя чырвоныя перцы, 4 лыжкі алею, 1 шклянка агароднінага булёну,1 шклянка сухога віна, 2 лыжачкі правансальскага зелля і сметанковае масла для змазання формы.

Выкананне: Абабраць часнок і цыбулю ды пакроіць дробна. Шампіньёны абабраць, заліць гарачай вадой, адварыць, пакроіць на ломцікі. Памідоры і чырвоны перац пакроіць у костачку. Моркву сцерці. На алею падсмажыць цыбулю і часнок. Калі падруменяцца, дадаць памідоры, перац, моркву і шампіньёны. Даправіць зеллем і тушыць 15 хвілін на малым агні.

Мяса абмыць халоднай вадой, асушыць папяровым ручнікам і пасаліць. Звязаць шнурком, абкласці размарынам і пералажыць у змазаную маслам форму. Уставіць у нагрэтую да 180°С духоўку. Па 30 мінутах паліць карэйку булёнам змешаным з віном і змазаць мёдам. Пячы 1,5 гадзіны. Пасля карэйку абкласці агароднінай і гарачай падаваць на стол разам з варанай бульбай або кашай.

Салат з кіслай капусты

Кампаненты: 700 г кіслай капусты, адна сярэдняя морква, 10 грэцкіх арэхаў, адна лыжачка журавіны, пятрушка, 2 лыжкі алею, соль, цукар і белы перац для смаку.

Выкананне: З кіслай капусты зліць сок і пакроіць яе. Грэцкія арэхі пакроіць і дадаць да капусты. Пасыпаць журавінамі, дадаць соль, цукар і перац. Дакладна вымяшаць і падаваць на стол.

Парэчкавы торт

Кампаненты: 100 г пшанічнай мукі, 100 г крухмалу, 250 г цукровай пудры, 4 яйкі, соль, 5 лыжак вады, 200 мілілітраў вяршкоў (крэмавай смятаны), ванільны цукар, 300 г марожаных парэчак і некалькі ягад вінаграду, масла і 2 лыжкі ячнай кашы для высыпкі формы.

Выкананне: Жаўткі ўцерці з 200 г цукровай пудры дадаючы ваду. Бялкі ўзбіць на пух і далікатна змяшаць з мукой, крухмалам і жаўткамі. Масу ўліць у раней змазаную маслам і пасыпаную ячнай кашай форму. Пячы 25 мінут у тэмпературы 180°С. Пасля, не вымаючы з формы, адставіць на 20 хвілін у халоднае месца. У тым часе салодкую смятану ўзбіць з ванільным цукрам і рэшткай пудры. Ахалоджанае цеста асцярожна выняць з формы і пры помачы доўгага нажа падзяліць на 2 роўныя часткі. Калі не маем вопыту, можна ўзяць доўгую ніць, прылажыць роўна пасярэдзіне цеста і перарэзаць. Атрыманыя роўныя часткі перакласці масай, а наверх пакласці размарожаную парэчку. Торт устаўляем на 20 хвілін у халадзільнік, а пасля падаем з чорнай кавай.

Апельсінавы понч

Прапанова на зімовыя вечары ў добрай кампаніі, спадабаецца напэўна ўсім закаханым!

Кампаненты: На 8 шклянак патрабуецца $^3/_4$ літра чырвонага віна, $^3/_4$ літра апельсінавага соку, 2 кілішкі чыстай гарэлкі, 2 пакецікі прыправаў для віна, 4 лыжкі цукру (або мёду), 1 лыжка лімоннага соку і ломцікі апельсінаў для дэкарацыі.

Выкананне: Віно разам з апельсінавым сокам уліць у гаршчок. Дадаць гарэлку, прыправы, цукар і лімонны сок. Дакладна змяшаць і падгрэць на малым агні, не дапускаючы каб усё заварылася! Гарачы понч наліць у шклянкі і ўпрыгожыць ломцікамі апельсіна.

Смачна есці!

Паўліна

Абвесткі

Вечарыны ў Старым Ляўкове і Гайнаўцы

** У суботу, 7 лютага г.г. а 17 гадзіне Праўленне гуртка Польскага саюза пенсіянераў, рэнтыстаў і інвалідаў (ПСПРіІ) у Старым Ляўкове арганізуе танцавальную вечарыну у тамашняй самаўрадавай святліцы. Як і на папярэдняй, стараляўкоўскія „Цаглінкі" выступяць з мініканцэртам.*

** 14 лютага г.г. Раённае праўленне ПСПРіІ у Гайнаўцы ладзіць у Гайнаўскім доме культуры па вул. Беластоцкай, 2, забаўляльную вечарыну для пажылых асоб. Танцаваць будуць ужо традыцыйна пад „жывую" музыку. Пачатак а 16 гадзіне.* (яц)

„Габеленак" запрашае

Гурток мастацкага ткацтва для дзяцей і моладзі „Габеленак", які дзейнічае ў Гайнаўскім доме культуры па вул. Беластоцкай, 2, пад кіраўніцтвам інструктара Зінаіды Якуць, запрашае на заняткі ў пластычную майстэрню ў кожную пятніцу а 16 гадзіне. Дэталёвую інфармацыю можна атрымаць таксама па тэлефоне 682-32-03. (яц)

Канцэрт у Нараўцы

7 лютага г.г. (субота) Гмінны асяродак культуры (ГАК) у Нараўцы запрашае на канцэрт гурту „Кантрольны вобраз". Канцэрт адбудзецца ў кіназале ГАК. Пачатак а 17 гадзіне. Уступ бясплатны. (яц)

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". У кожным нумары будзем друкаваць актуальныя прапановы павятовых устаноў па працаўладкаванню (ПУП) з Беластока, Гайнаўкі, Саколкі, Сямятыч і Бельска-Падляшскага. Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

ПУП у Бельску-Падляшскім, вул. 3 Мая, 17, тэл. 730-01-80

• спецыяліст па справах гандлю — вышэйшая адукацыя, некалькігадовы стаж, веданне камп'ютэра і англійскай мовы,

• інжынер-будаўнік — вышэйшая адукацыя, будаўнічыя правы, вопыт,

• майстар па рамонце прадметаў хатняга абсталявання — сярэдняя тэхнічная адукацыя, вадзіцельскія правы кат. В,

• работнік бюро абслугі кліента — сярэдняя адукацыя, веданне камп'ютэра.

ПУП у Гайнаўцы, вул. Пілсудскага, 10 а, тэл. 682-23-18

• лектар англійскай мовы — вышэйшая або сярэдняя адукацыя, сертыфікат ведання англійскай мовы,

• сантэхнік — пяць гадоў прафесійнага стажу, будаўнічыя правы ў галіне санітарнай тэхнікі,

• бармен — санітарны мінімум,

• кухар — вопыт,

• вахцёр — веданне англійскай або нямецкай моў,

• дрывасек-аператар пілы — праца на тэрыторыі Надляснiцтва Белавежа,

• работнік на ферме — вадзіцельскія правы кат. Т.

ПУП у Саколцы, вул. Крынская, 40, тэл. 711-56-46

• конкурс на пасаду „старшыня кааператыва", працоўны стаж — 10 гадоў, у тым 5 гадоў на кіраўнічай пасадзе, вышэйшая адукацыя, вадзіцельскія правы кат. АВ, веданне дзейнасці прадпрыемстваў на рынку, праца ў Крынках,

• спецыяліст па справах маркетынгу і продажу — вышэйшая адукацыя, веданне камп'ютэра, добрае веданне рускай мовы і тэхнічнай тэрміналогіі,

• кіраўнік магазіна — сярэдняя адукацыя, веданне камп'ютэра, гандлёвы вопыт,

• кіраўнік пякарні — сярэдняя адукацыя, веданне пытанняў кіравання і продажу,

• прадавец — сярэдняя адукацыя, веданне камп'ютэра,

• бухгалтар — вышэйшая адукацыя, мінімум пяцігадовы стаж,

• работнік на гадаўляна-аграрнай гаспадарцы — патрабаванні: ахвота да працы,

• рэферэнт у аддзеле продажу — сярэдняя адукацыя, стаж працы ў гандлі, веданне камп'ютэра і абароту гандлёвых дакументаў,

• шафёр грузавой машыны — вадзіцельскія правы кат. С+Е, правы на абслугу крана HDS, мінімум 2-гадовы стаж.

ПУП у Сямятычах, вул. Лэгіёнаў Пілсудскага, 3, тэл. 655-59-00

• прадавец,

• шафёр — вадзіцельскія правы кат. С+Е,

• шафёр — вадзіцельскія правы кат. Т, правы на збожжаўборачны камбайн,

• шавец — з пацверджанай катэгорыяй інваліднасці.

ПУП у Беластоку, вул. Сянкевіча, 82, тэл. 741-51-81

• пісар — з кваліфікацыямі,

• эканамічны працаўнік — веданне рахункаводства, эканамічнага аналізу рынку,

• акушэрка.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, стаж — тры гады апекі над малымі дзяцьмі, мае шмат часу і ахвоту да працы, у тым ліку дапамога ў хатніх працах, тэл. 6627036.

• Жанчына (43 г.), тэхнічная адукацыя, закончаны курс камп'ютэрнага рахункаводства, права працы і экатурызм, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат часу, тэл. 7304000 (Бельск-Падляшскі).

• Студэнтка V курса маркетынгу шукае працу ў Беластоку, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602769109.

• Студэнт шукае працу ў Гайнаўцы, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, аператыўны і ахвотны да працы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0606431022.

• Мужчына (35 г.), сярэдняя адукацыя, 16 гадоў працаваў сталяром, вадзіцельскія правы кат. В, уласная машына, уласныя майстэрня і матэрыялы, шукае новых кліентаў, зацікаўленых апрацоўкай хат у драўніне, арганізацыяй забудовы панадворкаў, індывідуальны падыход да кожнага кліента, мае вялікі вопыт у царкоўным будаўніцтве, тэл. 7303389 (Бельск-Падляшскі).

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра, арганізацыйныя здольнасці, добры падыход да дзяцей (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0692687442.

• Студэнтка (23 г.) ахвотна заапякуецца малым дзіцём у Беластоку ў ранніх гадзінах (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 7445293.

• Студэнтка ахвотна дапаможа старэйшай асобе за невялікай аплатай (апрача гэтага смачна зварыць), вольны час пасля абеду (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602322407.

Дапамагаем сабе ўзаемна

* Сям'я патрабуе цёплых, зімовых куртак для дзяўчат ва ўзросце 10, 12 і 13 гадоў.

* Адзінокая маці, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 12-гадовага хлопца і для 15-гадовых дзяўчат, пледаў і пасцелі.

* Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

* Сям'я з дзесяці асоб патрабуе пледаў, пасцелі, цёплага адзення для дзяцей.

Больш інфармацый пад нумарам тэл. 7121153.

* Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, як і іншае нязнішчанае адзенне, інфармацыя пад тэл. 7304000.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Нakład: 1 393 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2004 r. upływa 5 marca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Афарызмы Ладзіка Майніча

Народ і палітыка

Добра было б, калі б галасы не падлічвалі, а ўзважвалі.
Георг Ліхтэнберг

У канцы многіх заклікаў лягічна ставіць пытальныя знакі.

* * *

Тыраназаўры даўно вымерлі, а тыраны ўсё пладзяцца.

* * *

Ня кожны выбар ёсьць альтэрнатывай.

* * *

Пралетарыі Афрыкі ўсё жыцьцё марацъ пра лета.

* * *

„На тропу войны" імкнуцца перш за ўсё мізантропы.

* * *

Цікава, як гэта яна „грудью сражалась за родину"?

* * *

Ланцугі інтаграцыі пазбаўляюць палёту й грацыі.

* * *

Фіга ў кішэні — гэта зялёны плод пратэсту.

* * *

Ветэранаў вайны намнога болей, чым яе ўдзельнікаў.

* * *

Дзяржавы ваююць за новыя тэрыторыі, хоць людзям бракуе не зямлі, а паветра.

Адгаданка

За трыдзевяць зямель

(анаграмная шарада)

У казачнай краіне сабраўся сход —
Праваднікa рашыў абраць народ.
Вахцёр устаў і загадаў: Зважай!
Камандаваць парадам буду я!
Я з зорамі знаёмы, я — астролаг;
Мне крышачку лягло іх на пагоны:
Усходніх, пуцяводных, таварышаў куміраў —
Я навігатар — трымаюся іх шчыра.
Штурвал, стырно даверце мне! І **РУЛЬ** —
А мігам я маланкавым у рай вас завяду.
Я — залаценькі ўюн. **САБЕ** — *уматны домік,*
А вам усім высокія ўзвяду харомы!
Сталы там будуць, закуска і кілішкі
Заўсёды поўныя „Маскоўскай" і „Сталічнай"!
Вось маладзец! — народ магутна закрычаў
І праваднікам сваім вахцёра ён абраў.
Вахцёр мяшочак, што прыхаваў за спіну,
Адкрыў спярша. І выпусціў руплівую дубіну...

(Ш)

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне з першымі літарамі і іх лікам у паасобных разгаданых словах: **Б-8**.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 51 нумара

Саколка, княства, дзевяць, дружына, Варшава, Ташкент, Брусель.

Рашэнне: **Снежань**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Мал. Міраслаў Здрайкоўскі

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Варожка паглядзела на далонь Андрэя, расклала карты, доўга думала, нешта пашаптала і сказала:

— Будзеш, добры чалавеча, сем гадоў у бядзе жыць...

— А пасля?

— Пасля прывыкнеш.

* * *

— Чаму Бог стварыў жанчыну апошняй?

— Каб не сарвала Яго планаў.

* * *

Двух англічан падарожнічае ў адным купэ. Праз нейкі час адзін з іх пакінуў кніжку, якую чытаў і на нейкі час выйшаў. Калі вярнуўся, кніжкі ў пакінутым месцы не было. Ён спачатку абвінаваціў у пакражы спадарожніка, але неўзабаве ўбачыў сваю кнігу на падлозе.

— Выбачайце мне, — сказаў ён суседу, — за несправядлівае абвінавачанне.

— Нічога не сталася, — адказаў той. — Мы абодва памыліліся: вы палічылі мяне злодзеем, а я вас — джэнтльменам.

* * *

— Мішка, калі твая сястра хоча выйсці замуж?

— Заўсёды.

* * *

Назіральная рада выбірае дырэктара з ліку чатырох кандыдатаў. Усім ставяць аднолькавае пытанне: колькі будзе два плюс два?

— Чатыры, — адказаў першы.

— Пяць, — адказаў другі.

— Тры, — адказаў трэці.

— А колькі мае быць? — перапытаў чацвёрты. І ён стаў дырэктарам.



Мал. Алега Карповіча

8.02 – 14.02

Баран *(21.03 — 19.04)*. Прыемнае правядзенне часу сярод спрыяльных людзей. Дыпламатыя ў інтарэсах. Знайдзі час на сустрэчы. Стомішся ад працы. Поспех у мастакоў, рукадзельнікаў, кандытараў. Адзін з лепшых тыдняў твайго жыцця!

Бык *(20.04 — 20.05)*. 13 — 14 лютага — непрыемныя сутычкі з важнымі людзьмі. Начальнікі занадта патрабавальныя. Добры час на падарожжа. Слабенька з грашыма і здароўем. Можаш брацца за рамонт. Спраўна ў інтарэсах. У лютым Быкі худзеюць!

Блізняты *(21.05 — 21.06)*. 9 лютага магчымыя сваркі. Зважай на тое, што спажываеш. Свабода, магчымасць рабіць, што ўздумаеш. Спрыяе Венера. Дом кіпіць жыццём. Шанцы для камп'ютэршчыкаў, навукоўцаў, журналістаў.

Рак *(22.06 — 22.07)*. Хуткі тэмп жыцця. Распірае цябе энергія. Не канфліктуй, не прымушай іншых да сваіх ідэй. З партнёрам не будзь агрэсіўным. Лаві ўсіх сарок за хвост на працы — магчымыя новыя кантакты. Шмат выдаткаў. Пі святаяннік.

Леў *(23.07 — 22.08)*. Знакаміты настрой, кампанейскасць. Лёгка цябе „ўкапаць" у нейкую сітуацыю (давярай блізкай асобе). На працы не абяцай нічога навырост. Пільнуй дамоў. Арганізм аслаблены — не вер шарлатанам.

Дзева *(23.08 — 22.09)*. 8 — 9 лютага — асцерагайся ашуканства і сварак. Аптымізм. Любоўныя парывы. Добрая фізічная форма. На працы больш залежыць ад шчасця. Бярыся вывучаць мовы.

Шалі *(23.09 — 23.10)*. Паміж 7 а 25 лютага — карысныя прафесіянальныя кантакты (Меркурый у Вадалеі), бліснеш інтэлектам, добрымі парадамі. Выкідвай старыя, непатрэбныя рэчы. У любові — мімалётныя сітуацыі. Не раздражняй партнёра. Вялікае зацікаўленне да навінак, веды. Шмат энергіі ў прафесійных справах, горш з псіхікай (абцяжараная нервовая сістэма).

Скарпіён *(24.10 — 21.11)*. 9 лютага з-за квадратуры Плутона і Месяца, заклубуюць вакол цябе чужыя эмоцыі; пазбягай тлумных месцаў і не ўваходзь у дарогу непамяркоўным асобам. Пры такіх зорках любіць псавацца хатняе абсталяванне, лопаюць трубы, краны. Людзі і ўстановы настаўлены да цябе патрабавальна. Лёгка можаш захварэць грыпам, прастыць, знервавацца. Палі агонь.

Стралец *(22.11 — 21.12)*. Гавары аб сабе добра і шмат. Прафесійныя абавязкі пераплятаюцца з кампанейскімі. Будуць цябе цаніць. Будзеш душой кампаніі, добрым апекуном і дарадчыкам. Камунікатыўнасць і шчасце да людзей (увесь месяц!). Лёгкае хвяляванне настрояў.

Казярог *(22.12 — 20.01)*. 13 — 14 лютага Венера і Сатурн ствараюць квадратуру. Гэта прадказвае сардэчныя клопаты і непаладкі з блізкімі. Можаш быць зайздросным альбо прымушаным да нявыгадных уступак у інтарэсах. Асцярожна! Не будзь працаголікам! Любоўныя страсці цябе не мінуць! Ахвота пасядзець дома і яго ўпрыгожыць. Інтэнсіўная праца, добры вынікі і карысці. Усё на табе будзе гаіцца як на сабаку!

Вадалей *(21.01 — 19.02)*. Прыемныя заняткі. Інтэлектуальнае захапленне нейкай асобай (доўгія размовы!). Зацікаўленне асяроддзем. Пільнуй працы. Менш балюй. Нічога не рабі сілай!

Рыбы *(20.02 — 20.03)*. Сонца і Юпітэр падсунуць табе новыя ідэі. Пераходны этап — чакаюць цябе змены. Час на духоўнае і фізічнае аднаўленне. Займіся малымі рамонтамі, прыбіраннем. Асобе, якая нарадзілася 22 лютага, лёс прынесці можа незвычайную прыгоду. Рыбы з пачатку знаку могуць атрымаць цікавую прафесіянальную прапанову.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960